Голас Радзімы

№ 23 (2113)
8 чэрвеня 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Даклад Старшыні Вярхоўнага Савета СССР М. С. Гарбачова на З'ездзе народных дэпутатаў

[«Аб асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі СССР»]

Стар. 2—5

САПРАЎДНЫЯ БЕСТСЕЛЕРЫ ТЭАТРАЛЬНЫХ СЕЗОНАЎ

[«Змушае да ўласнага роздуму...»]

Стар. 6

СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ СЦЯПАНА НЕКРАШЭВІЧА

[«Старшыня інбелкульта»]

Стар. 7

«Калектыўны партрэт на фоне вясковай студні» — так хочацца назваць гэты здымак. На ім вы бачыце ўдзельніц мастацкай самадзейнасці Іванаўскага Дома культуры на Брэстчыне М. ЛУЦЭВІЧ, Н. ТАЛАТЫННІК, В. СТАСЮК. А зрабіў яго наш фотакарэспандэнт у вёсцы Пешкава таго ж раёна, на Палессі. Хаця мог зрабіць і ў любой іншай вёсцы, бо ў кожнай ёсць свая студня са сваім «жураўлём» ці «калаўротам», прычым такая, якой не стрэнеш нідзе болей. [Працяг фотарэпартажу пра іванаўскія студні змешчаны на 8-й старонцы].

АБ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАХ УНУТРАНАЙ І ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР

Даклад Старшыні Вярхоўнага Савета СССР М. С. ГАРБАЧОВА

Адной з самых важных падзей на З'ездзе народных дэпутатаў у Маскве, якую з нецярплівасцю і надзеяй чакалі і дэпутаты, і народ, было выступленне Старшыні Вярхоўнага Савета СССР М. С. Гарбачова з дакладам «Аб асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі СССР». Улічваючы вялікую цікавасць суайчыннікаў да праблем, якія абмяркоўваюцца на З'ездзе, газета прапануе ўвазе чытачоў даклад М. С. ГАРБАЧОВА з невялікімі скарачэннямі.

У гэтыя дні ў Крамлі адбываюцца падзеі, якія адзначаюць, што палітычная гісторыя Савецкага Саюза ў пакутах, у барацьбе з цяжкасцямі і складанасцямі ўступае ў новы дэмакратычны этап. У супярэчнасцях і жорсткіх сутыкненнях нараджаецца новы савецкі парламент, фарміруецца новая сістэма дзяржаўнага механізма, якая на практыцы ўключае ўсіх грамадзян у нялёгкую працу самакіравання. Гэта — думка нашых чэхаславацкіх сяброў, сказаная ў «Рудэ права».

Сёння наўрад ці ёсць неабходнасць даказваць, што сам З'езд і ўсё, што яму папярэднічала, характар распачатай дыскусіі — гэта пераканаўчая перамога перабудовы, па сутнасці, новая старонка ў лёсе нашай дзяржавы.

Спасціжэнне ісціны ўсімі разам і кожным з нас — нялёгкі працэс, але ён, таварышы дэпутаты, нам жыццёва неабходны. І зусім натуральна, што адкрыты разгляд усіх нашых спраў, бесстаронні аналіз прычын існуючага становішча, ходу пачатых пераўтварэнняў — усё гэта вызваляе грамадства ад акоў апатыі і раўнадушнасці, выклікае неспакой розумаў, сутыкненне пазіцый і прапаноў.

Пры ўсёй разнастайнасці думак дыскусія на З'ездзе сугучная асноватворным ідэям, абвешчаным КПСС пасля красавіка 1985 года, асабліва на XIX партыйнай канферэнцыі, перадвыбарнай праграме партыі. Гэта я канстатую з велізарным задавальненнем, таму што бачу ў гэтым выказванне важнай народнай падтрымкі палітыкі перабудовы.

Наш З'езд ужо ў першыя дні выразна адлюстраваў складаныя і супярэчлівыя працэсы, якія ідуць у краіне, інакш і быць не магло. К пачатку 80-х гадоў у выніку доўгіх гадоў застою краіна аказалася ў стане сур'ёзнага крызісу, які ахапіў усе сферы жыцця. Сітуацыя запатрабавала ад партыі крутога павароту. Гэта быў вельмі адказны выбар, і партыя яго зрабіла.

Сёння ўсе мы бачым правільнасць гэтага выбару. Хваля абнаўлення абудзіла краіну. Пачаўся, таварышы, працэс асваення новых форм грамадскага жыцця — у эканоміцы, палітыцы, культуры.

З'езд яшчэ раз прадэманстраваў глыбокае разуменне таго, што перабудова — гэта наш лёс, шанц, які дае нам гісторыя. Ён не можа і не павінен быць упушчаны. Пры ўсёй разнастайнасці і супярэчлівасці думак склалася своеасаблівая агульнанацыянальная згода ў тым, што палітычнаму курсу на абнаўленне, на карэннае абнаўленне сацыялізму альтэрнатывы няма.

Усё гэта так. Але сёння краіна чакае ад З'езда праўдзівага аналізу таго, як ажыццяўляецца перабудова, што яна прынесла ўжо, дзе і чаму яна яшчэ не апраўдала спадзяванняў, дзе і якія ўзніклі цяжкасці і праблемы. А галоўнае — людзі чакаюць канкрэтных рашэнняў, якія забяспечаць рух наперад.

Вось чаму такая важная пачатая на З'ездзе размова, якая задала тон свабоды і разняволенасці яго рабоце. Усіх нас чакаюць няпростыя рашэнні, усім нам несці за іх адказнасць перад савецкім народам. Але я ўпэўнены: З'езд праявіць узважанасць і дзяржаўную мудрасць пры ацэнцы сітуацыі і вызначэнні практычных мер.

Вядома, нельга чакаць імгненных змяненняў ва ўсіх сферах жыцця. Цяпер трэба неадкладна сканцэнтраваць усе намаганні, каб вырашыць у найкарацейшыя тэрміны набалелыя праблемы. У гэтым я бачу адну з асноўных задач З'езда, Вярхоўнага Савета і новага ўрада.

I.

Фундамент перабудовы і рашаючы фактар дасягнення яе мэт — глыбокія пераўтварэнні ў эканамічнай і сацыяльнай сферах. Сэнс усёй работы ў гэтай галіне — павярнуць эканоміку да чалавека, стварыць дастойныя нашага часу ўмовы працы і жыцця савецкіх людзей. Размова ідзе перш за ўсё аб такіх пытаннях, як прадукты харчавання, жыллё, паслугі, ахова здароўя і прыроды, уздым адукацыі, навукі і культуры.

Нам трэба калектыўна разабрацца ва ўзнікшай сітуацыі, падышоўшы да яе ацэнкі з праўдзівых, рэалістычных і патрабавальных пазіцый. Важна бачыць усю карціну, як яна ёсць, з тым каб замацаваць, надаць большую дынаміку і ўстойлівасць усяму, што ўдалося зрабіць пазітыўнага, у той жа час — рашуча збавіцца ад таго, што з'явілася вынікам дапушчаных пралікаў у палітыцы і практычнай дзейнасці як у цэнтры, так і на месцах.

Думаецца, мы маем права сказаць аб пачатым рэальным працэсе пераарыентацыі эканомікі на сацыяльныя патрэбы народа. Сярэднегадавы аб'ём жыллёвага будаўніцтва за тры апошнія гады павялічаны на 15 працэнтаў у параўнанні з мінулай пяцігодкай. Гэта значыць, што савецкія людзі атрымалі каля 900 тысяч кватэр. У мінулым годзе на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва выдзелена 1,9 мільярда рублёў крэдытаў — у 6 разоў больш супраць 1985 года.

У няпростых эканамічных умовах было выяўлена 6 мільярдаў рублёў дадатковых асігнаванняў на ахову здароўя і больш як 6 мільярдаў — на адукацыю. Павялічана заработная плата настаўнікам, працягваецца яе павышэнне ўрачам і іншым медыцынскім работнікам. У выніку прынятых мер у сярэднім за год у гэтай пяцігодцы ўводзілася больш, чым у мінулай, паліклінік — на 30 працэнтаў, школ — на 37, дзіцячых дашкольных устаноў — на 14, бальніц — на 20, клубаў і дамоў культуры — на 54 працэнты. Дамоў-інтэрнатаў для старэлых і інвалідаў пабудавана столькі, колькі за ўсю мінулую пяцігодку.

Упершыню ў нашай эканамічнай гісторыі рост выпуску тавараў народнага спажывання другі год запар апярэджвае развіццё прамысловасці ў цэлым. Удвая хутчэй, чым у мінулыя гады — на 15 працэнтаў штогод,— расшыраецца сфера паслуг. За апошнія тры гады звыш 5 мільёнаў сем'яў атрымалі зямлю пад садовыя ўчасткі і калектыўныя агароды.

Ужо ў першыя гады перабудовы перад намі паўстала праблема павышэння прадукцыйнасці працы шляхам узмацнення навукова-тэхнічнага прагрэсу. Толькі на такой аснове можна было будаваць рэальныя планы па развіццю эканомікі і паляпшэнню жыцця людзей. Пры ўсёй напружанасці з рэсурсамі на развіццё прыярытэтных напрамкаў машынабудавання і электронікі на дванаццатую пяцігодку было выдзелена практычна ў два разы больш капітальных укладанняў, чым у папярэднія пяць гадоў. І гэта зрабіць было неабходна, таму што тут мы моцна адсталі.

У нашай новай інвестыцыйнай палітыцы акцэнт робіцца на вырашэнне сацыяльных пытанняў. Але мы імкнёмся не траціць час і для стварэння задзелаў, звязаных з павышэннем навукова-тэхнічнага ўзроўню народнай гаспадаркі, каб і ў будучыні мець рэсурсы для паляпшэння жыцця народа.

Мы пакуль што не адчулі істотнай рэальнай аддачы ад гэтых мерапрыемстваў. У гутарках з многімі народнымі дэпутатамі пастаянна прысутнічае тэма дэфіцыту прагрэсіўнай тэхнікі і абсталявання, што стрымлівае мадэрнізацыю народнай гаспадаркі. Але ўсё ж тэмпы абнаўлення машынабудаўнічай прадукцыі пачалі расці. Паскораны рост прадукцыйнасці працы, пачалося скарачэнне колькасці занятых у сферы матэрыяльнай вытворчасці. Гэта таксама ўпершыню ў гісторыі нашай эканомікі.

Для чаго я аб гэтым гавару? Вы разумееце — не для таго, каб прыхарашыць нашы справы, паказаць іх у ружовым колеры. Гэта было б проста несур'ёзна, маючы на ўвазе і тых, хто сядзіць у гэтай зале, і тыя мільёны людзей, якія ўважліва сочаць за работай нашага З'езда.

Гэта неабходна для таго, каб глыбока разабрацца ў працэсах, якія адбываюцца, выявіць болевыя месцы, свайго роду вузлы напружання, што ўзніклі на шляху новых пазітыўных тэндэнцый і працэсаў.

У чым жа справа, чаму мы не адчуваем пакуль нават таго, што зроблена пазітыўнага? Перш за ўсё таму, што сур'ёзна разладжана фінансавая сістэма краіны, разрэгуляваны спажывецкі рынак. Разнастайныя дэфіцыты, таварная паніка выклікаюць у людзей вострае і законнае нездавальненне, сацыяльную напружанасць у грамадстве.

Прычыны тут розныя. Гэта — і цяжкая спадчына мінулага, і вялікія страты, звязаныя з падзеннем сусветных цэн на паліва і сыравіну, з чарнобыльскай трагедыяй, стыхійнымі бедствамі. Але правільна і тое, што сітуацыя ў эканоміцы ў немалой ступені звязана з нашымі ўласнымі дзеяннямі, а часам і бяздзейнасцю ўжо ў гады перабудовы.

Пачаць з таго, што дзяржава працягвае жыць не па сродках. Расходы бюджэту ў гэтай пяцігодцы растуць хутчэй за нацыянальны даход. Адсюль — растучы дэфіцыт бюджэту. Эканамічна гэта проста недапушчальна і нельга разглядаць інакш, чым сур'ёзны пралік у гаспадарчай палітыцы, за які ў першую чаргу нясуць адказнасць Міністэрства фінансаў СССР і яго апарат.

Фронт незавершаных работ у капітальным будаўніцтве не толькі не скараціўся, як гэта прадугледжвалася рашэннямі XXVII з'езда, а, наадварот, значна вырас—на 30 мільярдаў рублёў. І Дзяржплан, і Дзяржбуд СССР не ўстаялі перад націскам ведамстваў і мясцовых органаў, а ўрад не праявіў належнай патрабавальнасці.

Не вырашана такое карэннае пытанне эканамічнай рэформы, як стварэнне механізма рэгулявання і ўвязкі канчатковых вынікаў працы з фондам яе аплаты, без чаго немагчыма рухацца наперад у эканамічнай галіне. Узнікае сітуацыя, калі расходы на заработную плату растуць значна хутчэй, чым прадукцыйнасць працы.

Усе мы за тое, каб людзі добра зараблялі, каб іх заработкі няўхільна раслі. Але гэта павінна спалучацца з рэальнымі канчатковымі вынікамі іх працы. У адваротным выпадку грошай будзе многа, тавару мала. Сітуацыя складаная, як яно і ёсць. Наогул, таварышы, трэба неадкладна заняцца распрацоўкай гаспадарчага механізма, які вырашыў бы гэту праблему. Першыя крокі зроблены, першапачатковыя прапановы ёсць. Я разлічваю на глыбокае, кампетэнтнае абмеркаванне гэтых праблем на З'ездзе.

Аналіз прычын узнікшай сітуацыі быў бы няпоўным, калі не ўказаць на тое, што па-ранейшаму вялікія страты ад безгаспадарчасці, нізкай дысцыпліны працы. Вядома, усё гэта таксама звязана з асваеннем новага механізма. Але і яно адбываецца па-рознаму: адны па-сапраўднаму заняліся гаспадарчаразліковымі адносінамі, што прыносіць ужо свае вынікі, другія ж працягваюць жыць па-старому і проста топчуцца на месцы. Тут паўстае пытанне аб адказнасці кадраў на ўсіх узроўнях, іх кампетэнтнасці, адпаведнасці патрабаванням часу.

Усе нашы недапрацоўкі, недагляды і беды сышліся ў адной галоўнай праблеме сённяшняга дня — разбалансаванасці рынку. Менавіта яна зводзіць на нішто няхай пакуль што невялікія, але станоўчыя зрухі, пачатыя ўжо ў эканоміцы, у сацыяльнай сферы. Гэта пытанне набыло палітычны характар.

Неадкладна прыпыніць нарастанне негатыўных з'яў і перш за ўсё нармалізаваць становішча на рынку — вось сёння самая неадкладная задача.

Галоўнае тут —**хуткае нарошчванне вытворчасці тавараў паслуг,** з тым каб забяспечыць апераджальны рост таварных фондаў у параўнанні з грашовымі даходамі.

Ёсць, праўда, і іншы пункт погляду. Лічаць, што гэту праблему трэба вырашаць праз поўнае ўключэнне механізмаў рынкавай эканомікі: няхай рынак паставіць усё на месца. Мы не падзяляем такі падыход, гэта адразу ўзарвала б усю сацыяльную сітуацыю, парушыла ўсе працэсы ў краіне.

На гэты год пастаўлена задача павялічыць вытворчасць тавараў больш чым на 37 мільярдаў рублёў, а для таго, каб ужо ў наступным годзе значна палепшыць сітуацыю, трэба, паводле разлікаў вучоных і спецыялістаў, давесці гэты прырост да 55—60 мільярдаў рублёў.

У адпаведнасці з гэтым ужо разгарнулася вялікая работа ў галінах і рэспубліках. Запатрабуюцца велізарныя, можна сказаць, надзвычайныя намаганні і цэнтра, і месцаў, і працоўных калектываў. Але работа над гэтай праблемай паказвае, што рэальныя магчымасці мы маем. Павінны быць выкарыстаны рэсурсы не толькі лёгкай і харчовай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, але і ўсіх сектараў нашай эканомікі, уключаючы цяжкую прамысловасць і абаронныя прадпрыемствы. Словам, усе вытворчыя магутнасці, якія можна сёння пераарыентаваць на выпуск неабходных для насельніцтва тавараў народнага спажывання, павінны быць выкарыстаны.

З месцаў уносіцца многа прапаноў—як пусціць у ход наяўныя рэзервы, напоўніць рынак таварамі. Новы састаў урада з удзелам рэспублік павінен завяршыць гэту работу, распрацаваць канкрэтны план дзеянняў і прадставіць яго Вярхоўнаму Савету. Што датычыць недахопу простых тавараў, то, відавочна, на З'ездзе мы павінны пачуць ад нашага ўрада канкрэтны адказ наконт гэтага.

І, вядома, самыя рашучыя меры павінны быць прыняты па **аздараўленню фінансаў і ўпарадкаванню грашовага абарачэння краіны.** Тут не абысціся без унясення неабходных карэктываў ва ўсю гаспадарчую дзейнасць краіны, без распрацоўкі бюджэту надзвычайнай эканоміі. Відавочна, і па гэтаму пытанню З'езд мог бы даць спецыяльнае даручэнне ўраду.

Нарэшце, не варта скідаць з рахунку магчымасці імпарту як для развіцця лёгкай і харчовай прамысловасці, так і для папаўнення рынку спажывецкімі таварамі, агаворваючы ўмовы аб якіх не раз ужо заяўлялася.

У якасці задачы першарадной важнасці трэба выдзеліць выкананне рашэнняў сакавіцкага Пленума ЦК па **пытаннях аграрнай палітыкі і харчовай праблемы.** І таму, што гэта справа неадкладная, якая патрабуе агульнанародных намаганняў, і таму, што перабудова эканамічных адносін у вёсцы, пераход на новыя ўмовы гаспадарання ідуць з вялікай цяжкасцю, сустракаюць недастатковае разуменне, а нярэдка і прамое супраціўленне.

Сэнс жа палітычных установак і рашэнняў сакавіцкага Пленума ЦК у тым, каб праз новыя формы гаспадарання вярнуць чалавека на зямлю, даць яму ў рукі сродкі вытворчасці, зрабіць гаспадаром на зямлі і тым самым абудзіць асабісты інтарэс, узмацніць матэрыяльную зацікаўленасць у нарошчванні прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Разам з гэтым хачу падкрэсліць неабходнасць у першачарговым парадку заняцца сацыяльным упарадкаваннем вёскі, развіццём у вёсцы газадлю, жыллёвага будаўніцтва, камунальнай гаспадаркі, усёй інфраструктуры, асабліва дарог. Ва ўсіх рэгіёнах краіны сельскія жыхары вострае стаўляць пытанне газіфікацыі. Маючы велізарныя магчымасці, мы не маем права ўхіляцца ад вырашэння і гэтых пытанняў.

Народныя дэпутаты СССР, якія прадстаўляюць аграрны сектар, гавораць, што вельмі марудна перабудоўваюцца міністэрствы і ведамствы, якія выпускаюць для вёскі тэхніку і ўгнаенні. Тут нам трэба разабрацца. З аднаго боку, у краіне выпускаецца шмат тэхнікі, а з другога — скрозь стаіць крык аб тым, што яе не хапае. Значыць, выпускаюць не тую тэхніку. Дык давайце, нарэшце, унясём неабходныя карэктывы ў нашы праграмы, каб ужо ў бліжэйшыя гады арганізаваць выпуск сістэм машын, неабходных калгасам і саўгасам, арандатарам, асабістым падсобным гаспадаркам усіх рэгіёнаў. І што немалаважна— даступнай па цане. Прадстаў-

нікі аграрнага сектара гавораць, што машынабудаўнікі надзвычай павысілі цэны на ўсю тэхніку, хоць яна ў якасных адносінах па сваіх прадукцыйных магчымасцях мала змянілася.

Неабходна параіцца, таварышы, і аб іншых прыярытэтах сацыяльнай палітыкі на будучы перыяд. На адно з першых месцаў трэба паставіць пытанне **аб павышэнні жыццёвага ўзроўню малазабяспечанай** часткі насельніцтва—пенсіянераў, многадзетных сем'яў, сірот і інвалідаў.

Праблема гэта ў сучасных умовах, таварышы, мае велізарнае сацыяльна-палітычнае значэнне. Гутарка ж ідзе аб больш чым 40 мільёнах чалавек з нізкімі даходамі. Як ні цяжка яе вырашаць пры цяперашнім цяжкім фінансавым становішчы, гэта трэба зрабіць, прычым як мага хутчэй. Сярод важнейшых мер у гэтым напрамку — увядзенне новага Закона аб пенсіях, праект якога рыхтуе ўрад. Ён будзе прадстаўлены ў Вярхоўны Савет СССР і вынесены на ўсенароднае абмеркаванне. Мяркую, што закон такой важнасці павінен быць прыняты затым на З'ездзе.

Інтарэсы кожнага чалавека закранае **якасць медыцынскага абслугоўвання.** Здароўе нацыі — важнейшая ўмова яе поспеху ва ўсіх справах. Не будзем, таварышы, шкадаваць намаганняў, каб па ўсёй краіне была разгорнута сетка бальніц і паліклінік, аснашчаных сучаснай апаратурай, раз і назаўсёды вырашана праблема забеспячэння насельніцтва лекавымі сродкамі.

Пры ўсіх цяжкасцях мы знаходзім і, я спадзяюся, будзем знаходзіць сродкі на гэтыя мэты. Але вось справа з асваеннем гэтых сродкаў ідзе пакуль крайне нездавальняюча. А мы ж толькі па-сапраўднаму разгортваем работы па стварэнню сучаснай базы аховы здароўя ў краіне. Тут віна будаўнікоў і, я лічу, мясцовых органаў улады.

І другі момант. У сувязі з радыкальнай эканамічнай рэформай на прадпрыемствах і ў мясцовых органах кіравання накапліваюцца фінансавыя і матэрыяльныя рэсурсы. Мне здаецца, працоўныя калектывы маглі б аб'яднаць свае намаганні ў расшырэнні базы медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

Усе гэтыя пытанні трэба узяць пад жорсткі дэпутацкі кантроль.

Усталяванне здаровага ўкладу жыцця патрабуе асаблівай **увагі да аховы прыроднага асяроддзя,** або, як прынята цяпер гаварыць, экалагічнай бяспекі. Становішча тут трывожнае, калі не сказаць больш. У ста з лішнім гарадах краіны колькасць шкодных рэчываў у атмасферы перавышае дапушчальныя нормы. Цяжкая абстаноўка склалася з аховай водных рэсурсаў, рэк, лесу, з выкарыстаннем прыродных выкапняў, паўсюдна востра стаіць праблема захавання зямель, нават арашаемых. Трэба дзейнічаць, прычым неадкладна.

Тут мы павінны ісці двума шляхамі. Па-першае, трэба мець дакладную праграму па вырашэнню праблем, якія ўжо накапіліся. Гэта датычыць прамысловасці, сельскай гаспадаркі, водных рэсурсаў — словам, усяго асяроддзя існавання. Як мне здаецца, распрацоўка нацыянальнай праграмы наконт гэтага зацягваецца. Мы павінны на З'ездзе выказаць зусім пэўныя патрабаванні ў адрас тых, хто павінен паскорыць гэту работу.

Далей важна, каб сродкі, выдзяляемыя на гэту справу, поўнасцю асвойваліся. Вось мы гаворым, што накапілася многа праблем, што іх трэба вырашаць неадкладна, гэтак жа, як пытанні жылля, прадуктаў харчавання, тавараў. Гэта правільна. Калі цяпер не зоймемся асяроддзем існавання, нас чакае бяда. Яна ўжо на парозе, мы ўжо з ёй, так сказаць, сутыкнуліся ўшчыльную. Але паглядзіце: рэсурсаў на прыродахоўныя мэты выдзяляецца пакуль што мала, хоць яны і павялічваюцца штогод, а ў дадатак выкарыстоўваюцца яны менш, чым напалавіну. Так што, таварышы, давайце не толькі ўзнімаць гэтыя пытанні ў плане крытыкі, але і займацца канкрэтнымі справамі, вырашаць іх на практыцы. Паболь дзелавітасці і патрабавальнасці.

І другі, не менш важны напрамак. Трэба паставіць справу так, каб любы праект і навукова-тэхнічнае рашэнне забяспечвалі экалагічную бяспеку. Для гэтага яны павінны праходзіць строгую праверку на экалагічную чысціню. А мы, каб падзешавіць будаўніцтва, працягваем праштурхоўваць непрыгодныя з пункту погляду экалагічнай бяспекі праекты. Я гутарыў з адным з дэпутатаў з Камсамольска-на-Амуры, дзе калісьці пабываў. Там працоўныя скардзіліся, што прыходзіцца мэблю ў гэты край завозіць з цэнтра. І міністр, у той час таварыш Белавусаў, сказаў, што ёсць магчымасці выпускаць тут на 20 мільёнаў рублёў мэблі. Добрая справа. Узяліся, закупілі абсталяванне за рубяжом, але толькі не ўзялі тую частку, якая звязана з экалогіяй. Каму патрэбна такая эканомія? І ўжо ў Камсамольску-на-Амуры ідуць мітынгі з гэтай прычыны. Увогуле, паўтаруся, трэба, каб усе праекты праходзілі строгую праверку на экалагічную чысціню.

Як вы ведаеце, у ходзе перадвыбарнай кампаніі востра абмяркоўваліся пытанні будаўніцтва рада каналаў, атамных станцый, хімічных прадпрыемстваў з пункту погляду экалагічнай бяспекі. Паступаюць такія запіскі і цяпер у прэзідыум З'езда. Відавочна, Вярхоўнаму Савету СССР, адпаведным яго камісіям трэба будзе адразу ж прыняць гэтыя пытанні да самага ўважлівага разгляду і вырашэння. Пры гэтым павінны быць узяты пад увагу як экалагічныя патрабаванні, так і інтарэсы далейшага развіцця нашай эканомікі, без чаго немагчыма задаволіць надзённыя патрэбы народа.

У сувязі з разглядам сацыяльных пытанняў хачу выказаць упэўненасць, што З'езд пацвердзіць палітычную ўстаноўку XXVII з'езда партыі на **вырашэнне жыллёвай праблемы** — забяспечыць кожную сям'ю асобнай кватэрай або домам да 2000 года. Задача вельмі і вельмі няпростая. Але, таварышы, яе трэба вырашаць. Я пераканаўся яшчэ больш у абгрунтаванасці такой пастаноўкі, сустракаючыся з працоўнымі ва ўсіх рэгіёнах краіны. Скажу прама, першае пытанне, якое ставіцца ў гутарках, — нават не харчовае, не аб таварах, а жыллёвае. Улічваючы вастрыню гэтай праблемы для мільёнаў людзей у гарадах і ў вёсцы, нам, відаць, трэба пераацаніць намечаныя планы і адшукаць новыя магчымасці для расшырэння маштабаў жыллёвага будаўніцтва.

Мы давалі даручэнне вывучыць сітуацыю і вызначыць, што ж трэба, каб абавязкова выйсці на вырашэнне гэтай праблемы, каб, узяўшы на сябе такое абавязацельства перад народам, мы не аказаліся б банкрутамі. Напомню, у адзінаццатай пяцігодцы было пабудавана 550 мільёнаў квадратных метраў жылля. На дванаццатую пяцігодку пастаўлена задача давесці будаўніцтва жылля да 650 мільёнаў. Мы яе вырашым, гэта ўжо відаць. На трынаццатую пяцігодку ў намечаных планах ставілася задача давесці аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва да 820 мільёнаў квадратных метраў, а цяпер, па ўсім відаць, трэба выходзіць на 900 мільёнаў і на 1 мільярд квадратных метраў — у чатырнаццатай пяцігодцы. Тады можна будзе гаварыць аб рэальнасці выканання пастаўленай задачы.

Вядома, для гэтага павінны быць уключаны ў справу ўсе рэзервы, усе магчымасці прадпрыемстваў, індывідуальнага і кааператыўнага жыллёвага будаўніцтва. Недахопу ў ініцыятыве няма, людзі хочуць будаваць. Але што сёння стрымлівае — гэта недахоп будматэрыялаў, сантэхнікі, усяго таго, што неабходна для добраўпарадкавання жылля. Адусюль ідуць скаргі наконт гэтага. І справа тут не толькі ў мерах, якія павінны быць прыняты ў цэнтры, хоць іх абавязкова трэба паказаць у нашых планах. На вырашэнне задачы будаўніцтва жылля трэба наваліцца ўсёй грамадой, выкарыстаць усе мясцовыя рэзервы. Я б сказаў, што гэта — адна з важнейшых задач рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, іх гаспадарчых арганізацый.

Спадзяюся, у ходзе спрэчак мы паглыбім абмеркаванне гэтай тэмы, і з'езд дасць спецыяльнае даручэнне Вярхоўнаму Савету і новаму ўраду.

Таварышы! Сацыяльная палітыка не можа быць эфектыўнай, калі яна не адклікаецца на інтарэсы розных сацыяльных слаёў грамадства. Наша грамадства кроўна зацікаўлена ў тым, каб **забяспечыць лепшыя стартавыя ўмовы для новых пакаленняў,** якія ўступаюць у самастойнае жыццё, каб яны мелі ўсё неабходнае для раскрыцця сваіх творчых здольнасцей, для праяўлення энергіі маладосці, актыўнага ўдзелу ў справах дзяржавы. Тут накапілася нямала праблем.

Як вы ведаеце, ЦК ВЛКСМ падрыхтаваў праект Закона аб моладзі і ўнёс яго на разгляд Вярхоўнага Савета СССР у парадку заканадаўчай ініцыятывы. Але вядома, справа не зводзіцца да прыняцця аднаго закона, нават самага добрага. Трэба, каб да пытанняў падрыхтоўкі маладога пакалення, стварэння неабходных сацыяльных і іншых перадумоў для яго нармальнага ўключэння ў вялікае жыццё была прыкавана ўвага паўсюдна. Запатрабуецца вялікая пастаянная работа на гэтым напрамку. Мы чакаем канструктыўнага ўкладу і маладых дэпутатаў, і, вядома, усіх народных дэпутатаў у абмеркаванне пытанняў сацыяльнай палітыкі ў адносінах да моладзі краіны.

Мы абавязаны неадкладна ўзяцца за вырашэнне шматлікіх **вострых праблем, з якімі сутыкаюцца жанчыны.** Тут таксама неабходна цэласная сістэма мер, якая ўключае клопат аб мацярынстве, ахову жаночай працы і здароўя, аблягчэнне хатняй гаспадаркі і быту. Наконт гэтага ў ходзе выбарчай кампаніі было вельмі многа сказана выбаршчыкамі, гэтыя пытанні шырока ўключаліся ў праграмы практычна ўсіх народных дэпутатаў. Яны павінны быць самым уважлівым чынам і дэталёва разгледжаны — вядома, з улікам нашых магчымасцей. Гэта ўсё буйныя пытанні. Не абысціся без комплекснага да іх падыходу, не абмяжоўваючыся дэталямі.

Відавочна, у Вярхоўным Савеце неабходна мець пастаянныя камісіі, якія грунтоўна заняліся б прапрацоўкай усіх гэтых пытанняў. Або гэта можа быць камітэт — трэба параіцца. Увогуле, павінны быць створаны такія структуры, якія падрыхтавалі б сур'ёзныя прапановы Вярхоўнаму Савету і З'езду.

Наш маральны доўг і абавязак — **пастаянна клапаціцца аб ветэранах вайны і працы, тых,** хто адстаяў незалежнасць нашай Радзімы ў Айчыннай вайне, хто ў цяжкія гады паднімаў эканоміку краіны, умацоўваў яе індустрыяльную магутнасць, каму мы абавязаны ўсім, што маем.

Сярод народных дэпутатаў ёсць нашы старэйшыя таварышы, якія лепш за іншых ведаюць спадзяванні і патрэбнасці ветэранаў. **І мы павінны** прыслухацца да іх голасу, справядліва вырашаць пытанні, якія ставіць сёння жыццё.

Тут я хацеў бы сказаць вось пра што, таварышы. Ёсць многа простых жыццёвых пытанняў, якія павінны вырашацца мясцовымі, і ўжо тым больш рэспубліканскімі, органамі без усялякіх затрымак і чакання ўказанняў зверху. Тым больш, без дырэктыў З'езда народных дэпутатаў. Да таго ж, наконт гэтага ёсць і адпаведныя рашэнні ўрадавых органаў, якія абавязваюць праяўляць клопаты аб ветэранах вайны і працы, у першачарговым парадку вырашаць надзённыя для іх праблемы.

Не магу не сказаць і аб тым, што ў самых спагадлівых да сябе адносінах маюць патрэбу інваліды, усе ўдзельнікі афганскай вайны.

Вырашаючы праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, мы павінны зыходзіць **з паслядоўнага правядзення ў жыццё прынцыпу сацыяльнай справядлівасці.** Мала яго абвясціць — трэба яшчэ прывесці ў дзеянне сацыяльныя і эканамічныя механізмы, якія дадуць магчымасць ліквідаваць галоўны тормаз нашага развіцця — ураўнілаўку, псіхалогію ўтрыманства, якая глыбока ўкаранілася.

Мне ўжо даводзілася на З'ездзе закранаць праблему **сацыяльных ільгот і прывілей.** Дадам да сказанага наступнае. Сістэма льгот складвалася на працягу многіх дзесяткаў гадоў — няхай гэта дыферэнцыяцыя пенсій або водпускаў, ахова здароўя або жыллё, забяспечанымі дабротамі розных сацыяльных, узроставых, прафесіянальных груп насельніцтва і тэрыторый, а таксама розных ведамстваў. Відаць, да гэтых пытанняў трэба падыходзіць так, каб, з аднаго боку, стымуляваць талент і высокапрадукцыйную працу, а з другога — аказваць дапамогу тым групам насельніцтва, якія ў ёй маюць патрэбу. І ўжо, вядома, павінны быць выключаны ўсялякія скажэнні і тым больш злоўжыванні ў гэтай галіне.

Адсюль прапанова — даручыць спецыяльнай камісіі Вярхоўнага Савета СССР правесці на аснове гэтых крытэрыяў свайго роду «рэвізію» ўсіх ільгот і прывілей і ўнесці адпаведныя прапановы.

Мы бачым, таварышы дэпутаты, як многа накапілася праблем у сацыяльнай сферы. Адусюль чуваць просьбы і пажаданні аб задавальненні тых або іншых запатрабаванняў. Але, натуральна, прыходзіцца ўсё гэта сувымяраць з нашымі рэальнымі магчымасцямі.

Над чым тут трэба было б падумаць? Перш за ўсё — над **пераразмеркаваннем наяўных рэсурсаў у інтарэсах вырашэння самых надзённых праблем.**

Немалыя рэсурсы можна выслабаніць за кошт паляпшэння становішча спраў у інвестыцыйным комплексе краіны, **рэзкага скарачэння аб'ёмаў капітальных укладанняў у вытворчым будаўніцтве.** Называюцца розныя лічбы такога скарачэння — ад даволі ўмераных да вымяраемых дзесяткамі працэнтаў. Дарэчы, першыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены. Мэтазгодна, каб новасфарміраваны ўрад унёс свае прапановы ў сувязі з гэтым у Вярхоўны Савет СССР. Яны маглі б быць старанна вывучаны ў камісіях з прыцягненнем спецыялістаў, практычных работнікаў, вучоных, і на гэтай аснове ўнесены адпаведныя карэктывы ў праграму капітальнага будаўніцтва. Нам прыйдзецца прымаць цяжкія, але неабходныя рашэнні, на чымсьці спыняцца, ад чагосьці адмаўляцца.

Але ўжо цяпер я выказаў бы наступнае меркаванне. Нам трэба надзвычай строга прытрымлівацца правіла, каб аб'ёмы капітальнага будаўніцтва адпавядалі наяўным магутнасцям, матэрыяльным і працоўным рэсурсам. Толькі ў гэтым выпадку мы зможам пакончыць з будаўнічай ліхаманкай, пераадолець дыктат і безадказнасць будаўнічых ведамстваў і арганізацый.

Яшчэ адной крыніцай рэсурсаў на ажыццяўленне сацыяльных праграм з'яўляецца **скарачэнне ваенных расходаў,** забеспячэнне канверсіі, звязанай з выкарыстаннем у грамадскіх мэтах магутнага патэнцыялу абаронных галін.

Для нашага народа, які перанёс цяжкую вайну, надзейная абарона была і застаецца пытаннем жыццёвага значэння, гэтак жа як прадметам асаблівага клопату была і застаецца наша Савецкая Армія. Але ў сучасным свеце павялічваюцца магчымасці стварыць умовы для бяспекі палітычнымі і дыпламатычнымі сродкамі. Гэта дазваляе скараціць ваенныя расходы на аснове надання новай якасці Узброеным Сілам СССР без урону для абараназдольнасці краіны.

У 1987—1988 гадах ваенныя расходы былі замарожаны. Гэта дало эканомію ў бюджэце, у параўнанні з тым, што прадугледжвалася пяцігодкай, 10 мільярдаў рублёў. У 1989 годзе ваенныя расходы складаюць 77,3 мільярда рублёў — я аб'яўляю З'езду гэту рэальную лічбу. Уносіцца прапанова скараціць ваенныя расходы ў 1990—1991 гадах яшчэ на 10 мільярдаў рублёў, гэта значыць на 14 працэнтаў. І заняцца ў Вярхоўным Савеце далейшай распрацоўкай усяго гэтага складанага комплексу — з улікам і ўнутраных патрэбнасцей, і задач забеспячэння надзейнай абараназдольнасці краіны.

Ужо часткова скарочаны расходы на касмічныя праграмы. Яны не так і вялікія. Вы зможаце потым пры канкрэтнай прапрацоўцы з імі пазнаёміцца. Трэба знайсці далейшыя магчымасці ў гэтым напрамку. Але пры гэтым трэба ўлічваць, што дзякуючы найноўшым касмічным распрацоўкам мы атрымліваем унікальныя тэхналогіі. Дастаткова сказаць, што найноўшыя распрацоўкі, зробленыя ў рамках аднаго толькі праекта «Буран», могуць даць значны эфект — размова ідзе аб мільярдным эфекце, — калі перадаць іх у народную гаспадарку і для экспарту. На Савеце Абароны прапановы наконт гэтага былі прадстаўлены ў двух тамах, і яны накіраваны дзесяткам прадпрыемстваў, арганізацый народнай гаспадаркі. Толькі ў гэтым выпадку будуць апраўданы затраты, якія мы нясём у сувязі з асваеннем космасу. Велізарныя магчымасці тоіць у сабе выкарыстанне ў грамадзянскім сектары унікальных тэхналогій, распрацаваных на прадпрыемствах абароннай прамысловасці. Сёння створаны ўмовы, каб пакончыць з неразумнай сакрэтнасцю, пакласці канец так званаму ўнутранаму КАКОМу.

Немалыя магчымасці ў пераразмеркаванні рэсурсаў у карысць сацыяльнай сферы закладзены ў **скарачэнні кіраўніцкіх расходаў.** Новыя ўмовы гаспадарання дазваляюць ісці па шляху карэннай перабудовы сістэмы кіравання.

Мы расходуем на ўтрыманне кіраўніцкага апарату ў краіне каля 40 мільярдаў рублёў у год, прычым на ўтрыманне органаў дзяржаўнага кіравання — 2,5 мільярда рублёў, астатняе — на апарат кіравання аб'яднанняў і прадпрыемстваў. Трэба ўнесці яснасць у гэта пытанне.

Трэба зусім ясна ўяўляць, што вырашыць першачарговыя сацыяльныя праблемы і стварыць задзел на будучыню мы можам толькі на шляхах паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, забяспечваючы апераджальнае развіццё фундаментальных навук, распрацоўку і ўкараненне авангардных тэхналогій.

Гэтак жа павінна быць ясна і іншае: выцягнуць эканоміку з багны немагчыма без радыкальнай эканамічнай рэформы, пераводу ўсіх гаспадарчых звенняў на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне, без шырокага развіцця арэнды і кааперацыі. Праз рэформу мы павінны прыйсці да новай мадэлі эканомікі.

(Заканчэнне на 4-5-й стар.).

АБ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАХ УНУТРАНАЙ І ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР

(Заканчэнне. Пачатак на 2-3-й стар.).

Аб эканамічнай рэформе, аб тым, што яна дала, якія праблемы ўзніклі ў ходзе яе ажыццяўлення, цяпер вядуцца, прама скажам, вострыя дэбаты ў грамадстве. З улікам гэтага мы ў Цэнтральным Камітэце даволі грунтоўна прааналізавалі ход эканамічнай рэформы. Адбылося нямала сустрэч па гэтых пытаннях з вучонымі-эканамістамі, кіраўнікамі і спецыялістамі, прадстаўнікамі вытворчых калектываў. Агульны вывад такі: стратэгічная задума рэформы, яе асноўныя напрамкі вызначаны правільна.

Але ў практычным ажыццяўленні рэформы на ўсіх узроўнях дапускаецца многа непаслядоўнасці, нерашучасці, палавінчатасці, зігзагаў і нават адступленняў. Інакш кажучы, спазняемся са стварэннем эканамічнага асяроддзя, ва ўмовах якога рэформа толькі і можа набіраць сілу, разгортвацца і даваць чакаемы вынік, па сутнасці справы цяпер менавіта ў гэта, у адсутнасць такіх эканамічных механізмаў, упіраецца далейшы рух наперад рэформы.

Менавіта ў такой абстаноўцы ўзніклі розныя прачытанні адносна далейшага лёсу рэформы. Можна чуць думку, што многія нашы беды ў эканоміцы выклікаены новымі метадамі гаспадарання, што з рэформай спяшацца не трэба.

З такім падыходам згадзіцца нельга. У ЦК і ўрадзе лічаць, што магістральны шлях развіцця народнай гаспадаркі — гэта паслядоўнае разгортванне эканамічнай рэформы. У гэтым напрамку мы лічым неабходным карэкціраваць нашу эканамічную палітыку і практычную дзейнасць.

Вопыт паказвае, што рэформу немагчыма ажыццявіць у выглядзе аднаразовага акта. Перавод эканомікі з аднаго рэжыму функцыяніравання ў другі — справа складаная. Каб больш паспяхова яго прайсці, неабходна паскорыць распрацоўку і ажыццяўленне рада ўзаемазвязаных крокаў, накіраваных на паслядоўнае змяненне метадаў планавання, фінансавых рычагоў, цэн, падаткаў, умоў аплаты працы, усіх астатніх звенняў гаспадарчага механізма. Прычым многае з гэтага павінна быць ажыццёўлена яшчэ да пачатку дзеяння трынаццатага пяцігадовага плана.

І яшчэ, таварышы. Жыццё пераканаўча паказала, што эканамічная рэформа проста немагчыма без радыкальнага абнаўлення адносін сацыялістычнай уласнасці, развіцця і спалучэння яе розных форм. Мы — за стварэнне сістэмы гібкіх і эфектыўных адносін па выкарыстанню грамадскага набытку, каб кожная форма ўласнасці ў жывым спаборніцтве, у справядлівым спаборніцтве даказвала сваю жыццёвую сілу і права на існаванне. Адзіная ўмова, якую трэба пры гэтым паставіць, — недапушчэнне эксплуатацыі, адчужэння работніка ад сродкаў вытворчасці.

З такім падыходам да ўласнасці непарыўна звязаны і другі рашаючы напрамак эканамічнай рэформы — станаўленне паўнакроўнага сацыялістычнага рынку. Зразумела, рынак не ўсемагутны. Але другога, больш эфектыўнага і дэмакратычнага механізма гаспадарання чалавецтва не выпрацавала. Без яго сацыялістычнай планавай эканоміцы не абысціся, таварышы. Гэта трэба прызнаць.

Мы лічым, што па меры паглыблення рэформы будзе адбывацца фарміраванне такой сістэмы адносін у гаспадарцы, якую можна назваць прававой эканомікай. Яна будзе базіравацца не на адміністрацыйных распараджэннях, не на загадах, а на адносінах, урэгуляваных законам. Адбудзецца дакладнае раздзяленне дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай і гаспадарчага кіравання.

Галоўнымі дзеючымі асобамі ў эканоміцы павінны стаць прадпрыемствы, канцэрны, акцыянерныя таварыствы, кааператывы. Для вырашэння агульных задач і каардынацыі намаганняў яны, відаць, пойдуць па шляху стварэння на добраахвотнай аснове аб'яднанняў, саюзаў і асацыяцый, да якіх пяройдуць функцыі гаспадарчага кіравання, выконваемыя цяпер міністэрствамі. У справядлівасці такога падыходу пераконвае і наш вопыт, і агульнасусветныя тэндэнцыі ў развіцці эканомікі.

Прыняццем Законаў аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні) і аб кааперацыі мы зрабілі важны, але толькі першы крок па шляху да такой эканомікі. Ды і самі гэтыя законы маюць патрэбу ва ўдасканаленні. Наконт гэтага ў грамадстве ідуць вялікія дыскусіі. Выказваецца вельмі многа крытычных заўваг аб нераўнапраўных умовах, у якіх працуюць прадпрыемствы, што адносяцца да розных сектараў эканомікі. У сувязі з гэтым і з боку вучоных, гаспадарнікаў, самых шырокіх слаёў працоўных—гэта прагучала ў маіх гутарках з дэпутатамі — усё больш настойліва ставіцца пытанне аб выпрацоўцы адзіных эканамічных і прававых асноў дзейнасці прадпрыемстваў. Мне ўяўляецца, гэта пытанне мае велізарнае значэнне і заслугоўвае вялікай увагі з боку З'езда.

Як бачыце, таварышы, праблемы далейшага развіцця і паглыблення рэформы зоймуць вызначальнае месца ў нашай далейшай дзейнасці. Відавочна, трэба ў Вярхоўным Савеце мець адпаведныя структуры і механізмы. Ёсць сур'ёзныя падставы стварыць і ва ўрадзе спецыяльны каардынацыйны орган па рэформе на чале з адным з намеснікаў Старшыні Савета Міністраў СССР.

II.

Таварышы дэпутаты! Мы з вамі з поўнай падставай можам канстатаваць — і гэта ўжо тут прагучала, — што самай буйной заваёвай перабудовы з'яўляецца шырока разгорнутая **дэмакратызацыя дзяржаўнага і грамадскага жыцця** краіны. Прайшоўшыя выбары народных дэпутатаў СССР, работа нашага З'езда, атмасфера, у якой ён праходзіць, — пераканаўчае таму пацвярджэнне.

Мы з самага пачатку паставілі пытанне так: любыя задумы карэннага абнаўлення жыцця грамадства асуджаны на правал, калі ў гэтыя рэвалюцыйныя па свайму зместу працэсы не будуць з самага пачатку ўключаны ўсе слаі грамадства, увесь народ. Гэта было пакладзена ў аснову ўсіх нашых рашэнняў пачынаючы з красавіцкага Пленума ЦК 1985 года і атрымала разгорнутае абгрунтаванне ў рашэннях XIX партыйнай канферэнцыі, якая прызнала адным са стратэгічных напрамкаў перабудовы — правядзенне радыкальнай палітычнай рэформы і пабудову сацыялістычнай прававой дзяржавы.

Цяпер мы можам рухацца далей, выкарыстоўваючы велізарныя магчымасці, якія адкрыла рэалізацыя задач першага этапа рэформы. Я маю на ўвазе скліканне гэтага З'езда і фарміраванне новых вышэйшых органаў улады.

Канкрэтная праграма дзейнасці вызначыцца пасля абмеркавання ўсяго кола, гэтых пытанняў тут, на З'ездзе, на пасяджэннях Вярхоўнага Савета, яго палат, новаўтвораных камітэтаў і камісій. Дазволю сабе таму спыніцца толькі на некаторых пытаннях, якія маюць, як мне ўяўляецца, прынцыповае значэнне для далейшай дэмакратызацыі нашага грамадства.

Перш за ўсё — гэта **рэалізацыя зноў выстаўленага намі гістарычнага лозунга «Улада Саветам!»** Рэканструкцыя прадстаўнічых органаў, усямернае расшырэнне іх правоў і паўнамоцтваў згодна з Канстытуцыяй, безумоўнае падпарадкаванне ім апарату — гэта першая ўмова вяртання Саветам рэальных рычагоў улады і кіравання. За гэта тут ужо многія выказваліся, і мы павінны зафіксаваць гэта ў падагульняючых дакументах нашага З'езда.

Другая такая ўмова — **дакладнае размежаванне функцый партыйных і дзяржаўных органаў.** Партыя рашуча асудзіла парадкі, пры якіх яе арганізацыі падмянялі савецкія органы, выконвалі, па сутнасці справы, функцыі прамога кіравання гаспадаркай, ды і ўсімі іншымі сферамі жыцця. Беручы на сябе неўласцівыя задачы, партыйныя камітэты страчвалі здольнасць крытычна ацэньваць ход развіцця грамадства і выконваць ролю яго авангарднай сілы.

Выступіўшы ініцыятарам і галоўнай рухаючай сілай перабудовы, Камуністычная партыя з'яўляецца сёння гарантам гэтага рэвалюцыйнага працэсу, абароны яго ад замахаў і кансерватыўных, і ўльтралявацкіх элементаў. Менавіта яна здольная выконваць ролю інтэгруючай сілы, без якой не можа быць даведзена да паспяховага завяршэння справа абнаўлення сацыялізму.

Перабудова на глыбока дэмакратычных асновах мяняе ролю партыі, яе ўзаемадзеянне з дзяржавай, з грамадскімі арганізацыямі. Для партыі сёння галоўнае — выказваць і гарманізаваць інтарэсы асноўных сацыяльных груп, слаёў насельніцтва, усяго народа, забяспечваць кансалідацыю ў дзейнасці ўсіх звенняў палітычнай сістэмы грамадства.

Партыя прапануе дыялог і супрацоўніцтва ўсім грамадскім арганізацыям і рухам, запрашае іх да сумесных дзеянняў па перабудове і абнаўленню грамадства.

Цэнтральнае пытанне другога этапа палітычнай рэформы— **стварэнне новай структуры органаў улады і кіравання ў рэспубліках, краях і абласцях, гарадах і раёнах.** Гэта патрабуе перш за ўсё ўнясення неабходных карэктыў у выбарчую сістэму з улікам вынікаў і ўрокаў прайшоўшай выбарчай кампаніі. Прыступіць да такой работы трэба неадкладна, паколькі, як я разумею, за гэта выказваліся ўсе народныя дэпутаты, якія тут выступалі.

У выніку мы павінны атрымаць такі выбарчы закон, які ўвабраў бы ўсё лепшае, што забяспечыла дэмакратычны характар прайшоўшых выбараў, і, вядома, ліквідаваў бы выяўленыя недахопы.

Другое, не менш важнае пытанне. Новыя прадстаўнічыя органы павінны атрымаць не толькі паўнацэнныя юрыдычныя паўнамоцтвы, але і рэальныя рычагі ўлады. А для гэтага трэба, каб Вярхоўны Савет адразу ж узяўся за падрыхтоўку Законаў аб рэспубліканскім гаспадарчым разліку і самафінансаванні, аб самакіраванні і мясцовай гаспадарцы. Трэба, відаць, пабудаваць работу камісій і палат так, каб гэтыя важныя дакументы былі падрыхтаваны для абмеркавання і прыняцця ўжо да другога З'езда народных дэпутатаў.

Размова ідзе аб прынцыповых пытаннях, якія датычаць структуры федэратыўнай дзяржавы, правоў і магчымасцей мясцовых Саветаў, расшырэння самакіраўніцкіх асноў ва ўсёй нашай палітычнай сістэме. Я прама скажу: лозунг «Уся ўлада Саветам!» без распрацоўкі і прыняцця гэтых законаў павісне ў паветры, застанецца проста лозунгам, заклікам. Відаць, і на гэтым З'ездзе народным дэпутатам будзе што сказаць наконт гэтага. Гэта стане каштоўным укладам у далейшую работу над дакументамі.

У кантэксце такога падыходу трэба вырашаць пытанне аб тэрмінах правядзення выбараў у рэспубліканскія і мясцовыя Саветы. Як вы помніце, у нас быў намер правесці іх восенню гэтага года. Па крайняй меры, з гэтага мы зыходзілі на XIX партыйнай канферэнцыі, абмяркоўваючы пытанні маючай адбыцца палітычнай рэформы.

Але, відаць, не ўсё мы ўзважылі і не ўсё змаглі прадбачыць. Рэальныя працэсы палітычнай рэформы падводзяць да таго, што стварэнне ўсіх прававых прадпасылак для правядзення выбараў, грунтоўная іх падрыхтоўка патрабуюць яшчэ вялікай работы. Пачынаць яе трэба ўжо цяпер, але, відавочна, толькі восенню, на другім З'ездзе, мы зможам прыняць законы, якія адносяцца да рэспубліканскіх і мясцовых Саветаў.

Павінен сказаць, што ад партыйных і савецкіх органаў ужо паступаюць прапановы правесці чарговыя выбары ў тэрміны, прадугледжаныя Канстытуцыяй, гэта значыць будучай вясной, калі канчаюцца паўнамоцтвы дзеючых Саветаў.

Як першы этап палітычнай рэформы, так і ўсё, што трэба будзе зрабіць на чарговых яе этапах, з'яўляецца рухам наперад па шляху **стварэння сацыялістычнай прававой дзяржавы.** Але, вядома, гэтым не вычэрпваюцца задачы, звязаныя з яе будаўніцтвам. Задача гэта значна больш маштабная, ахоплівае шырокае кола дэмакратычнага рэгулявання жыцця грамадства.

На першы план тут выходзіць прававая абароненасць асобы, забеспячэнне ўсіх умоў для таго, каб грамадзянін мог карыстацца ўсімі правамі і, натуральна, выконваў свае абавязкі перад дзяржавай.

Усе нашы крокі па будаўніцтву прававой дзяржавы, іх эфектыўнасць павінны вымярацца галоўным крытэрыем — што яны даюць савецкаму чалавеку.

Вядома, як востра ставілася выбаршчыкамі ў ходзе выбараў пытанне аб годнасці грамадзяніна, яго прававой абароненасці. У многім гэта — вынік мінулай палітычнай практыкі, якая зыходзіла з прымату інтарэсаў дзяржавы над інтарэсамі людзей. Руплівасцю аб дзяржаўных інтарэсах апраўдваліся нярэдка факты самавольства, парушэння канстытуцыйных правоў грамадзян, бюракратычных да іх адносін.

Мы рашуча адхіляем такі падыход як несумяшчальны з агульнадэмакратычнымі і сацыялістычнымі каштоўнасцямі і ідэаламі. Не можа агульнае шчасце будавацца на несправядлівасці, дапушчанай у адносінах хоць бы да аднаго чалавека. Кожны грамадзянін нясе адказнасць за свае ўчынкі перад грамадствам, але і грамадства, дзяржава нясуць адказнасць перад грамадзянінам за захаванне яго законных правоў, недатыкальнасць асобы і маёмасці.

Усё гэта — агульныя прынцыпы, таварышы. Для таго, каб яны па-сапраўднаму пачалі працаваць, увайшлі ў нашу грамадскую практыку, запатрабуецца прыняць цэлую серыю законаў. Частка з іх ужо распрацоўваецца і ў недалёкай будучыні можа быць вынесена на абмеркаванне камісій Вярхоўнага Савета. Гэта — праекты Законаў аб свабодзе веравызнання, аб друку, аб грамадскіх арганізацыях, аб моладзі і рад іншых. Мы павінны прывесці ў адпаведнасць з часам, з новымі ўяўленнямі і задачамі і крымінальнае, і грамадзянскае, і працоўнае, і сямейнае заканадаўства. Інакш кажучы, абноўленае грамадства павінна апірацца на абноўленае заканадаўства.

Неабходнасць абнаўлення нашага заканадаўства па пытаннях правоў чалавека вызначаецца таксама тым, што Савецкі Саюз стаў удзельнікам Венскіх пагадненняў, і дзеючыя ў нас прававыя нормы павінны адпавядаць міжнародным пактам.

Словам, Вярхоўнаму Савету, а затым і З'езду прыйдзецца грунтоўна папрацаваць, каб падвесці трывалую прававую базу пад усе бакі грамадскага жыцця.

Вельмі важным этапам на шляху стварэння сацыялістычнай прававой дзяржавы з'яўляецца судова-прававая рэформа. Як вы ведаеце, мінулай восенню пры ўнясенні дапаўнення ў Канстытуцыю ў яе былі ўключаны палажэнні аб выбранні народных суддзяў вышэйстаячымі Саветамі народных дэпутатаў. Гэта найважнейшая ўмова незалежнасці суда была, дарэчы, усенародным патрабаваннем.

Але на гэтым напрамку трэба будзе вырашыць яшчэ многа важных праблем, і ў першую чаргу — узняць узровень кадраў, закліканых вяршыць правасуддзе, забяспечваць найстражэйшую законнасць, стаяць на варце грамадскага парадку. Трэба распрацаваць і ажыццявіць шырокую праграму расшырэння юрыдычнай адукацыі ў краіне, паклапаціцца аб матэрыяльнай базе судова-следчых органаў, аб матэрыяльным становішчы работнікаў гэтай сферы. Павінны быць знойдзены аптымальныя рашэнні многіх пытанняў, якія ўзнімаюцца цяпер у сувязі з судовай рэформай. Яны закраналіся і на пасяджэнні нашага з'езда. Я маю на ўвазе магчымасць увядзення суда прысяжных, парадак следства, кантролю за ім і г. д. Усё гэта трэба абмеркаваць.

Уся велізарная работа па судовай рэформе патрэбна, вядома, не сама па сабе, а ў інтарэсах умацавання правапарадку ў краіне. Гэта задача набыла асаблівую злабадзённасць у сувязі з павелічэннем колькасці злачынстваў, у тым ліку такіх небяспечных, як карупцыя, мафія, вымаганне, хабарніцтва. Актуальнай праблемай з'яўляецца барацьба з хуліганствам, якое падрывае нармальныя ўмовы жыцця, працы і адпачынку людзей.

Думаю, дэпутаты згодзяцца з тым, што нам трэба ўмацаваць, падтрымаць прававахоўныя органы, але і запатрабаваць ад іх эфектыўных мер па выкараненню злачыннасці.

Дэмакратыя можа існаваць

толькі пры дакладнай рэалізацыі ўсімі — дзяржавай, грамадскімі арганізацыямі, кожным калектывам і кожным грамадзянінам сваіх правоў і абавязкаў. Гэта — аксіёма.

Не магу не сказаць і аб тым, што з'яўляецца цяпер прадметам растучай занепакоенасці нашых людзей. Я маю на ўвазе спробы некаторых асоб і груп дабівацца сваіх асабістых або групавых мэт шляхам арганізацыі масавых беспарадкаў, правакавання актаў насілля. Такія рэчы нецярпімыя ў прававой дзяржаве. Законныя мэты могуць і павінны дасягацца законнымі ж сродкамі, незаконныя — спыняцца. Калі мы не здолеем абараніць дэмакратыю, публічнасць, гэта можа самым драматычным чынам адбіцца на лёсе краіны і народа.

Словам, трэба праціпаставіць усім праціпраўным дзеянням не толькі аргументы розуму, заклікі да сумлення, думку грамадскасці, што, вядома, павінна быць на першым плане, але і сілу права. Толькі так можа жыць і развівацца дэмакратычнае грамадства.

Наш З'езд не можа пакінуць без увагі і адносіны да пытання, наконт якога ў грамадстве нарастае сур'ёзны неспакой. Я маю на ўвазе цяперашні стан дысцыпліны і парадку. Калі гаварыць прама, ён нас не задавальняе, патрабуе рашучага змянення да лепшага. З-за нізкай дысцыпліны, дрэннага выканання службовых абавязкаў мы нясём вялікія страты — і эканамічныя, і маральныя. У сферы працы, у першую чаргу.

Дэмакратызацыя мае патрэбу ў павышэнні дысцыпліны на аснове росту сацыяльнай актыўнасці людзей. Усякай расхлябанасці мы павінны праціпаставіць высокую адказнасць за даручаную справу. І не саромецца павышаць патрабаванне на дысцыпліну і парадак.

III.

Таварышы! Нават першыя дні работы з'езда зноў выявілі вастрыню **нацыянальнага пытання,** складанасць міжнацыянальных адносін. Сапраўды, многанацыянальнасць — унікальная ўласцівасць нашай дзяржавы і грамадства. З аднаго боку — гэта крыніца яе сілы. З другога — пры нават нязначных перакосах у нацыянальнай палітыцы яна можа стаць і прычынай аслаблення дзяржавы, нестабільнасці ў грамадстве з непрадказальна цяжкімі вынікамі.

Час высвеціў правільнасць нацыянальнай палітыкі, выпрацаванай Уладзімірам Ільічом Леніным. Вынікі, якія яна прынесла ўсім нашым народам, немагчыма пераацаніць. Была праведзена велізарная работа па пераадоленню нацыянальнага прыгнёту і няроўнасці, уздыму эканомікі і развіццю культуры ўсіх нацый, якія насяляюць краіну. Да нашага вопыту праявілася пільная ўвага ва ўсім свеце, ...і гэтага ні ў якім разе не варта забываць.

Аднак у 30-я гады ленінская нацыянальная палітыка была падвергнута грубым скажэнням і дэфармацыям. Іх адчулі на сабе практычна ўсе народы. Спрошчанае разуменне шматграннага характару нацыянальных адносін, заахвочванне тэндэнцый да унітарызму, адмаўленне спецыфікі нацыянальнага развіцця, палітычныя абвінавачванні цэлым нацыям з вынікаючымі адсюль самавольствам і беззаконнасцю, недапушчальнае атаясамленне нацыянальных пачуццяў людзей з нацыяналістычнымі праяўленнямі — усё гэта было ў нашым жыцці. Тут, як гаворыцца, ні дадаць, ні адняць.

Нам дасталася вельмі няпростая спадчына. Прычым негатыўныя працэсы ў нацыянальных адносінах у часы застою альбо ігнараваліся, альбо заганяліся ўнутр, што вяло да ўсё большага іх абвастрэння. Рана ці позна яны павінны былі выйсці на паверхню.

Дэмакратызацыя і публічнасць дазволілі ўбачыць усю праўду і пачаць выпраўляць дапушчаныя перакосы, ліквідоўваць несправядлівасці. Але неабходна прызнаць, што ў пачатку перабудовы мы далёка не ў поўнай меры ацанілі неабходнасць абнаўлення нацыянальнай палітыкі. Мабыць, была дапушчана і затрымка з вырашэннем рада неадкладных пытанняў. А між тым, натуральная незадаволенасць эканамічнымі і сацыяльнымі праблемамі, якія накапіліся, стала ўспрымацца як ушчамленне нацыянальных інтарэсаў. Спекулюючы на гэтых агульных цяжкасцях, пэўныя элементы імкнуліся яшчэ больш ускладніць сітуацыю. Гэта прывяло ў радзе рэспублік да эксцэсаў, парадзіла вядомыя ўсім трагічныя вынікі з чалавечымі ахвярамі.

Дазвольце з гэтай трыбуны, трыбуны З'езда народных дэпутатаў, выказаць наш агульны смутак і боль у сувязі з гібеллю невінаватых людзей. Гэта не павінна паўтарыцца.

Ясна, што мы абавязаны поўнасцю аздаравіць нацыянальныя адносіны, вызваліць іх ад усяго, што супярэчыць нашай маралі і ідэалогіі, гуманным прынцыпам сацыялізму.

Гаворачы аб абнаўленні нацыянальнай палітыкі, мы маем на ўвазе неабходнасць прывесці яе ў адпаведнасць з рэаліямі цяперашняга дня. Змяніліся эканоміка, дэмаграфія, сацыяльная і нацыянальная структура ўсіх рэспублік. Узрасла нацыянальная самасвядомасць, паявіліся новыя патрэбнасці ў духоўным жыцці. Многія грані нацыянальных адносін паўстаюць сёння ў новым святле.

Цяпер, можна сказаць, ствараецца палітычны механізм, закліканы забяспечыць разумны і справядлівы падыход да пытанняў міжнацыянальных адносін, выпрацоўку такіх рашэнняў, якія адпавядалі б як інтарэсам кожнай з савецкіх нацый, так і агульнанародным інтарэсам. Я маю на ўвазе і праекты ўжо апублікаваных законаў па гэтых пытаннях, і вялікую падрыхтоўчую работу да Пленума ЦК, спецыяльна ім прысвечанага, і што асабліва важна — будучую работу Вярхоўнага Савета, яго камісій, у рамках якой нацыянальныя праблемы павінны знайсці комплекснае і ўсебаковае вырашэнне.

Прынцып нацыянальнага самавызначэння, сфармуляваны Леніным, быў і застаецца адным з галоўных элементаў нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі. Ён быў закладзены ў аснову сацыялістычнай дзяржаўнасці пры стварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

І довады гістарычнага парадку, і эканамічны разлік, і палітычная свядомасць, і проста разважны сэнс, вопыт народаў гавораць аб жыццёвай неабходнасці развіцця ўсіх савецкіх нацый у рамках федэратыўнай саюзнай дзяржавы. Самым важкім аргументам на карысць гэтага з'яўляецца перабудова, якая стварае ўмовы для выпраўлення любых памылак і дэфармацый, што дапускаліся ў мінулым, для сапраўднай гарманізацыі міжнацыянальных адносін, для нармальнага нацыянальнага самаадчування кожнага чалавека, дзе б ён ні нарадзіўся, жыў і працаваў.

Але цяпер неабходна напоўніць федэратыўную будову дзяржавы рэальным палітычным і эканамічным зместам з тым, каб гэта форма цалкам задавальняла патрэбнасці і спадзяванні нацый, адпавядала рэаліям сучаснасці.

У цэлым вузлавыя моманты нацыянальнай палітыкі перабудовы мы бачым наступным чынам.

У палітычнай галіне—гэта істотнае расшырэнне правоў саюзных і аўтаномных рэспублік, іншых нацыянальных утварэнняў; перадача на месцы ўсё больш шырокага кола кіраўніцкіх функцый; узмацненне самастойнасці і адказнасці рэспубліканскіх і мясцовых органаў. У федэратыўнай дзяржаве павінна быць дакладна вызначана, што адносіцца да кампетэнцыі Саюза, а што з'яўляецца суверэнным правам рэспублікі, аўтаноміі. Неабходна распрацаваць прававыя механізмы вырашэння калізій, якія могуць узнікнуць у іх узаемаадносінах.

У эканамічнай галіне неабходна гарманізацыя адносін паміж Саюзам і рэспублікамі на аснове арганічнага спалучэння іх эканамічнай самастойнасці і актыўнага ўдзелу ў агульнасаюзным падзеле працы. З такога пункту погляду трэба было б перабудаваць рэгуляванне адзінага народнагаспадарчага комплексу краіны, арганічна ўключыўшы перавод рэспублік, рэгіёнаў, краёў і абласцей на самакіраванне і самафінансаванне, у агульны працэс абнаўлення савецкай эканомікі.

Прынцыпова важна, каб новы падыход да развіцця рэспубліканскай гаспадаркі і мясцовага самакіравання не вёў да аўтаркіі, якая ў сучасным свеце выглядае анахранізмам, а садзейнічаў паглыбленню кааперацыі, якая адпавядае інтарэсам кожнай рэспублікі і ўсёй краіны.

Да эканамічных праблем цесна прымыкаюць дэмаграфічныя і экалагічныя. Тут таксама трэба ўмела спалучаць агульнасаюзныя і рэспубліканска-рэгіянальныя інтарэсы.

У духоўнай сферы мы зыходзім з прызнання разнастайнасці нацыянальных культур як найвялікшай сацыяльнай і гістарычнай каштоўнасці, унікальнага набытку ўсяго нашага саюза. Ні адну з іх мы не маем права недаацаніць або тым больш страціць, бо кожная з іх непаўторная.

Мы — за свабоднае, усебаковае развіццё кожнага народа, нацыянальнай мовы і культуры, за раўнапраўныя і дружалюбныя адносіны ўсіх нацый, народнасцей, нацыянальных груп.

З'езду народных дэпутатаў, Вярхоўнаму Савету СССР трэба будзе вырашыць нямала складанейшых пытанняў у сферы міжнацыянальных адносін. І дазвольце мне выказаць упэўненасць, што іх глыбокая прапрацоўка дазволіць нам узбагаціць ленінскую нацыянальную палітыку прымяняльна да сённяшніх рэалій савецкай многанацыянальнай дзяржавы, стварыць тым самым надзейную палітычную аснову для далейшага ўпэўненага развіцця краіны.

IV.

Таварышы! Перабудова ў Савецкім Саюзе не магла не адбіцца на ўсёй нашай **міжнароднай дзейнасці**, але яна і не магла ажыццяўляцца пры захаванні ранейшай знешняй палітыкі.

Карэннае змяненне знешнепалітычнага курсу звязана з новым палітычным мысленнем, якое выпрацоўвалася па меры вызвалення ад дагматычных уяўленняў, ад вывадаў, правільных толькі для свайго часу, але якія перасталі адпавядаць рэаліям нашых дзён.

Новае мысленне — гэта дынамічная канцэпцыя, якая працягвае развівацца, паглыбляцца. А галоўным яе адпраўным пунктам застаецца вывад XXVII з'езда КПСС аб смяротнай небяспецы ядзернай зброі і гонкі ўзбраенняў для існавання чалавецтва, аб цэласнасці і ўзаемазалежнасці сучаснага свету, змяненні характару яго супярэчнасцей і зместу сусветнага прагрэсу.

У аснове новага мыслення ляжыць прызнанне прыярытэту агульначалавечых інтарэсаў і каштоўнасцей; агульнапрынятых норм маралі як абавязковага крытэрыя ўсякай палітыкі; свабоды сацыяльна-палітычнага выбару, якая выключае ўмяшанне ў справы любой дзяржавы; неабходнасці дэідэалагізацыі міждзяржаўных адносін. Нягледзячы на глыбокія адрозненні сацыяльных сістэм, у кожнай з іх паявіліся аб'ектыўныя магчымасці для выхаду на прынцыпова новы, мірны перыяд у гісторыі чалавецтва.

У навакольнай рэчаіснасці колькі хочаце фактаў, якія, здавалася б, не ўкладваюцца ў напрамак новага мыслення. Ёсць сілы мінулага і супярэчнасці, атрыманыя ў спадчыну ад мінулага. Таму мы не можам адмовіцца ад арміі і развітацца са зброяй. Тое ж можна сказаць аб ваенных саюзах, захаванне якіх залежыць не толькі ад нас.

Але як бы ні былі яшчэ неабходныя старыя формы і сродкі, нельга дазволіць, каб яны блакіравалі новыя падыходы да будаўніцтва міжнародных адносін. У гэтым мудрасць усякай вялікай палітыкі. І ў гэтым — якаснае адрозненне знешняй палітыкі перыяду перабудовы. Адстойваць яе мы цяпер можам, апіраючыся на рэальныя вынікі. Многае ўжо стала прывычным, здаецца нармальным. Але дзе б мы былі, калі б усё засталося, як раней?

Знізіўся напал міжнароднай напружанасці. Няма прамой пагрозы ядзернай вайны. Людзі розных краін як бы паглядзелі ў твар адзін аднаму і зразумелі недарэчнасць варожасці. Пачалося скарачэнне ядзерных арсеналаў. Еўрапейцы прыступілі да зніжэння ваеннага процістаяння, самага небяспечнага ў свеце. Мы вывелі войскі з Афганістана. Пачалі іх выводзіць з саюзных краін. Краіна адкрылася для знешняга свету, каб заняць дастойнае месца ў міжнародным падзеле працы і карыстацца яго перавагамі. Зняты абмежаванні і забароны, якія перашкаджалі нашаму дзейснаму ўдзелу ў вырашэнні глабальных праблем, у навуковым і культурным абмене.

Наша знешняя палітыка звернута да ўсяго свету. Але ў кожным канкрэтным выпадку ёсць, натуральна, свая спецыфіка, свае асабліва важныя акцэнты — як двухбаковага плана, так і з пункту гледжання рэгіянальнай і міжнароднай значнасці.

У першую чаргу гэта датычыць сацыялістычных краін. Узаемаадносіны з імі адлюстроўваюць вельмі адказны этап у развіцці сацыялістычнага свету. У поўную меру мы адчулі гэта ў час візіту да нашага вялікага суседа, у Кітайскую Народную Рэспубліку, нармалізацыя адносін з якой — падзея сусветнага значэння.

Цяжкасці фарміравання новага тыпу ўзаемаадносін сацыялістычных краін ёсць і могуць быць. Яны — у аб'ектыўных рэальнасцях складаных і супярэчлівых працэсаў, якія адбываюцца ў розных краінах. Але гэтыя цяжкасці пераадольныя. Асноўная ўмова тут — узаемная павага, неўмяшанне ў справы адзін аднаго, сяброўскае ўзаемаразуменне, глыбокая цікавасць да вопыту кожнага і патрэбнасць у супрацоўніцтве, гатоўнасць да сумеснай цярплівай работы. Усё гэта ёсць цяпер.

Важнейшы напрамак нашай знешнепалітычнай дзейнасці — удзел у будаўніцтве «агульнаеўрапейскага дома». Прынцыповыя ідэі вядомы. Яны ўвайшлі ва ўжытак грамадскай думкі і перагаворнай практыкі. Асновы здаровых, у духу перабудовы, адносін з усімі дзяржавамі, якія ўдзельнічаюць у Хельсінкскім працэсе, закладзены і набіраюць дынаміку.

Мы будзем няўхільна працягваць уладзівастоцкую лінію ў азіяцка-ціхаакіянскім рэгіёне. Разнастайнасць задач тут яшчэ большая. З многімі краінамі вызначыліся і «парадак дня», і танальнасць адносін — добразычлівая, канструктыўная, паважлівая. Ёсць тут, як усюды, краіны, адносінам з якімі будзем і ў далейшым удзяляць асаблівую ўвагу, і ў першую чаргу — вялікая Індыя.

Усім нам зразумела, што савецка-амерыканскія адносіны маюць першараднае значэнне для сусветнай палітыкі. Мы гатовы ўзаемадзейнічаць з ЗША на прадказальнай і стабільнай аснове, гатовы рухацца наперад, спалучаючы пераемнасць з новымі ідэямі.

Выявілі мы ў гэтыя гады неардынарныя магчымасці для больш блізкіх і прадукцыйных сувязей з Лацінскай Амерыкай і Афрыкай. Тут таксама ёсць і агульныя праблемы, і свая спецыфіка ў адносінах з асобнымі краінамі.

Першарадным нашым клопатам застаецца ўмацаванне добрасуседства з усімі сумежнымі дзяржавамі.

З'езду народных дэпутатаў трэба будзе разгледзець і заканадаўча зацвердзіць **прынцыпы нашага знешнепалітычнага курсу на будучыя гады.** Лічу, размова павінна ісці аб наступным:

— бяспека краіны павінна забяспечвацца перш за ўсё палітычнымі сродкамі як састаўная частка ўсеагульнай і роўнай бяспекі, у працэсе дэмілітарызацыі, дэмакратызацыі і гуманізацыі міжнародных адносін, з апорай на аўтарытэт і магчымасці ААН;

— ядзерная зброя павінна быць ліквідавана ў ходзе перагаворнага працэсу, арыентаванага на раззбраенне і скарачэнне абароннага патэнцыялу дзяржаў да межаў разумнай дастатковасці;

— недапушчальныя прымяненне сілы і пагроза сілай у мэтах дасягнення якіх-небудзь палітычных, эканамічных або іншых мэт; у адносінах з іншымі краінамі з'яўляецца бяспрэчнай павага суверэнітэту, незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці;

— не канфрантацыя, а дыялог і перагаворы з устаноўкай на баланс інтарэсаў павінны стаць адзіным спосабам вырашэння міжнародных праблем, урэгулявання канфліктаў;

— мы за ўключэнне савецкай эканомікі ў сусветную гаспадарку на ўзаемавыгадных і раўнапраўных асновах, актыўны ўдзел у фарміраванні і захаванні правіл сучаснага міжнароднага падзелу працы, навуковага і тэхнічнага абмену, гандлю, за супрацоўніцтва з усімі, хто гатоў да гэтага.

І яшчэ адно прынцыповае пытанне.

У мінулым наша знешнепалітычная практыка ў некаторых выпадках ішла ўразрэз з абвешчанымі высокімі прынцыпамі сацыялістычнай знешняй палітыкі. Дапускаліся самавольныя дзеянні, якія наносілі краіне сур'ёзны ўрон, негатыўна адбіваліся на яе міжнародным аўтарытэце. Гэта было вынікам усё той жа каманднай сістэмы, уласцівага ёй келейнага прыняцця рашэнняў.

Адна з важных задач рэканструюемай намі палітычнай сістэмы — выключыць падобныя парадкі і метады. У далейшым усе значныя знешнепалітычныя рашэнні павінны прымацца толькі пасля грунтоўнага іх абмеркавання ў Вярхоўным Савеце і яго камісіях. .

Адабрэнне З'ездам народных дэпутатаў СССР названых прынцыпаў мае не проста юрыдычнае, але і велізарнае палітычнае значэнне — міжнароднае і ўнутранае. Далёка не ўсе на Захадзе вераць, што мы выбралі гэты курс назаўсёды і не маем намеру яго мяняць. Ды і ў нас у краіне не ўсе яшчэ разумеюць фундаментальную сутнасць знешняй палітыкі, заснаванай на новым мысленні. Сёй-той разглядае яе як свайго роду тактыку, часовы зігзаг або нават як уступкі Захаду.

Таму хачу падкрэсліць і спадзяюся, што З'езд падтрымае такую заяву: гэта наша глыбока абгрунтаваная стратэгічная лінія, якая выражае інтарэсы савецкага народа і адпавядае, як мы ўпэўнены, інтарэсам усяго чалавецтва.

Тут, на З'ездзе, выказвалася прапанова накіраваць ад нашага З'езда пасланне народам свету. Думаю, нам ёсць што сказаць людзям зямлі.

ДРАМАТУРГІЯ І ТЭАТР БЕЛАРУСІ Ў ЗАМЕЖНАЙ КРЫТЫЦЫ

«ЗМУШАЕ ДА ЎЛАСНАГА РОЗДУМУ...»

Гана ХВАТАЛАВА

КАНЕЦ МАЛОГА АПОСТАЛА

Беларускі драматург Андрэй Макаёнак праславіўся перш за ўсё як аўтар сатырычных камедый на актуальную тэматыку. Прыгадаем з яго творчасці хоць бы камедыі «Выбачайце, калі ласка!» (па-чэшску яна называлася «Камяні ў печані»), «Лявоніха на арбіце» або трагікамедыю «Трыбунал».

Асновай для другой трагікамедыі «Зацюканы апостал», напісанай у канцы шасцідзесятых гадоў, сталі асабістыя ўражанні і звесткі аб жыцці ў некаторых заходнееўрапейскіх краінах, з якімі аўтар пазнаёміўся ў час сваіх замежных паездак. Ён расказвае ў п'есе аб распадзе самых, здавалася б, цесных духоўных сувязей у сям'і, распадзе, абумоўленым спажывецкай мараллю, прыярытэтам матэрыяльнага дабрабыту, што прыводзіць да абыякавасці, няздольнасці выслухаць аргументы іншых, да ігнаравання існуючых маральных каштоўнасцей.

Галоўны герой п'есы Сын (у радыёпастаноўцы — Том), таленавіты і ўдумлівы падлетак, мары якога быць карысным людзям нішчыць недзіцячы скептыцызм і расчараванне, глядзіць на свет як бы звысоку і ў той жа час з горыччу, якая раз'ядае яго чулую душу. Ён раздвойваецца паміж сваімі ідэаламі, крыху наіўнымі амбіцыямі і фальшывай, крывадушнай мараллю сваіх бацькоў, жывучы ў душнай атмасферы эмацыянальнага вымагання, да якога ён знешне нібыта і прыстасоўваецца, але ў душы пратэстуе, гэтак жа, як і яго малодшая сястра. Трагічны фінал, калі юны герой быццам бы без асаблівай для сябе шкоды пераносіць падзенне з трэцяга паверха, калі ўжо нават перапалоханыя члены сям'і, сведкі нішчаснага выпадку, уздыхнулі з палёгкай, завяршаецца абсурднай кульмінацыяй: выяўляецца, што пры падзенні нешта адбылося з псіхікай юнака (ён робіцца гэткім жа абыякавым да ўсяго, як і яго блізкія). Гэты фатальны парадокс выклікае шок і панурае пачуццё безсілля і скепсісу.

Надзвычай удалай пастаноўкай п'есы Макаёнка (у перакладзе і апрацоўцы Ярмілы Мікулашкавай) радыёстудыя горада Брно ўзбагаціла цыкл сваіх «Нядзельных тэатральных вечароў» у трансляцыі на Прагу. П'есу ў аранжыроўцы для радыё Сватавы Ружычкавай паставіла рэжысёр Эва Ржэгаржава. Ролі выконвалі брненскія артысты Душан Баўэр, Мардэла Пянязава, Яраслаў Дуфек, Здэна Герфартава, Отакар Дадак і Іржы Брож.

У выніку атрымаўся надзвычай цікавы радыётвор, які ў поўнай адпаведнасці са словамі самога аўтара трагікамедыі «не скажу, што мая хата з краю», робіцца палымяным зваротам да людзей, змушае слухачоў да ўласнага роздуму над лесвічкай жыццёвых вартасцей.

Тэатры ўсіх краін свету адзіныя не толькі ў сваім імкненні зрабіць лепшымі, дабрэйшымі свет і людзей, што ў ім жывуць, яны яшчэ цесна звязаны паміж сабой тым найлепшым, таленавітым, што стварыла творчае натхненне мастакоў слова і сцэны, дзе б яны ні жылі. Таму на афішах нашых тэатраў пазначана не адно імя замежнага драматурга, а да нашых сцэнічных дасягненняў пільна і ўважліва прыглядваюцца знаўцы з іншых, перадусім суседніх, краін. І тое, што ім здаецца ў нас цікавым і значным, праз некаторы час можна ўбачыць на іх сцэне, на іх тэлеэкране, пачуць па радыё. Тым самым ствараюцца ўсё новыя і новыя прыступкі, па якіх нашы народы ўзнімаюцца да вышынь узаемапазнання і ўзаемаразумення.

Друкуем уражанні чэшскай рэцэнзенткі аб пастаноўцы п'есы Андрэя Макаёнка на чэшскім радыё і артыкул польскага журналіста пра Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага.

мейную сагу ўваходзяць раскулачванне, калектывізацыя, палітычныя рэпрэсіі канца трыццатых гадоў, а потым вайна, Галгофа ўяўляецца нечым надзвычай рэальным.

Васіль Быкаў, адзін з найвыдатнейшых савецкіх празаікаў, у сваёй вядомай аповесці «Знак бяды» ўключыў яе ў лёс беларускага народа. Пара галоўных герояў — Сцепаніда і яе муж Пятрок — вымушаны прайсці па чарзе этапы бяды, якія былі лёсам усіх, ад раскулачвання да вайны. Назва аповесці шматзначная. Знакам бяды можа быць таксама і крыж. Таксама ці перадусім? У сцэнічнай версіі аповесці Быкава, якую паставіў мінскі тэатр імя Горкага, народ узнімае крыж як сімвал веры і ўласных пакут. Аднак прастаіць крыж нядоўга. Ён будзе скінуты, калі на беларускую зямлю прыйдзе новы лад.

Аповесць і яе інсцэніроўка пачынаюцца ў адзін і той жа гістарычны час — на пераломе дваццатых і трыццатых гадоў. Крыж, які ў аповесці ставіць адзін з яе герояў,— вынік пэўнага роздуму над лёсам чалавека, лёсам, які ўжо збыўся. На сцэне сітуацыя трохі іншая. Мізансцэна з крыжам, уласна кажучы, адкрывае спектакль. У пастаноўцы Валерыя Маслюка, які з'яўляецца рэжысёрам спектакля, знак пакут Хрыста — гэта сімвал, глыбока ўкаранёны ў свядомасці чалавека. Тое, што павінна адбыцца далей, будзе надаваць сімвалам рэальны абрыс, напаўняць іх чалавечым зместам.

Ліквідацыя знака не азначае знікнення з'явы, якую ён абазначае. Зусім наадварот, знак узбуйняе памер з'явы, напаўняе яе новым зместам і новымі драмамі. Уладзімір Высоцкі ў адным са сваіх вершаў гаварыў: «На братских могилах не ставят крестов, но разве от этого легче?» У мінскай пастаноўцы гэтая ісціна пацвярджаецца на іншых рэаліях.

Валерый Маслюк некалькі разоў прапануе акцёрам затрымацца як бы на паўкроку. Можна было б сказаць, што ён выкарыстоўвае прыём кіно, што гэта нешта накшталт стоп-кадра. Але важна не тое, як назваць гэты рэжысёрскі прыём, важна тое, чаму ён служыць. У «Знаку бяды» людзі камянеюць, уражаныя тым, што яны раптам заўважылі. Ёсць у гэтым нешта ад трагічнага азарэння. У гэтую долю хвіліны іх жыццё ўявіцца ім Галгофай.

«Знак бяды» — спектакль не новы. Тэатр падрыхтаваў яго да саракагоддзя заканчэння вайны, якое адзначалася ў маі 1985 года. Маслюк распачаў над ім працу, можна сказаць, у іншы гістарычны перыяд. Мне расказвалі, што не абышлося без цэнзурных прыдзірак. Можна дамысліць, што на пераломе 1984—1985 гадоў сімволіка гэтай пастаноўкі магла выклікаць сумненні пільнага чыноўніка. Аднак Маслюку ўдалося давесці спектакль да прэм'еры.

У снежні 1988 года гэтым спектаклем тэатр пачаў паказ сваіх дзесяці «фірменных» пастановак. Наступнай па парадку была паказана пастаноўка новай п'есы Аляксея Дударава «І быў дзень». Два гэтыя творы: аповесць Быкава, напісаная ў пачатку 80-х гадоў, і п'еса Дударава, апублікаваная часопісам «Театр» у верасні 1988 года,— даюць уяўленне аб маштабе перамен у Савецкім Саюзе.

Дудараў — драматург прызнаны. Яго імя называюць у сузор'і тых пісьменнікаў, якім савецкая сцэна шмат чым абавязана ў апошніх дзесяцігоддзі. Яго «Вечар», «Парог», «Радавыя» былі сапраўднымі бестселерамі нядаўніх сезонаў. «Радавых» паставілі больш чым сто савецкіх тэатраў, «Парог» меў больш за шэсцьдзесят увасабленняў. Бадай, можна сказаць, што, з аднаго боку, выдатная проза Быкава, з другога, высока ацэненая драматургія Дударава вызначаюць імкненні тэатра імя Горкага ў галіне сучаснай літаратуры, у галіне ж класікі іх вызначаюць цудоўны шэкспіраўскі «Макбет», які некалькі гадоў назад абмяркоўваўся на старонках «Пшыязні», і «Гамлет». Дададзім яшчэ «Майстра і Маргарыту» паводле Міхаіла Булгакава — гэта таксама плён работы калектыву, якім на працягу ўжо некалькіх сезонаў кіруе рэжысёр сярэдняга пакалення Валерый Маслюк.

Зрэшты, справа не толькі ў амбіцыях тэатра імя Горкага — не ўхіляецца ён і ад так званага «лягчэйшага» рэпертуару. Але галоўную задачу бачыць у тым, каб прапанаваць гледачу падумаць над нялёгкімі праблемамі яго часу. Як «Макбет», так і «Гамлет» былі наскрозь палітычнымі драмамі сучаснасці. Нельга было ўсумніцца ў тым, што маральная раздвоенасць прэтэндэнтаў на шатландскую карону з'яўляецца доляй і сучаснага чалавека, гэтак жа, як няцяжка было зразумець, што «нешта прагніло» не толькі «ў каралеўстве дацкім». Сёння, гледзячы з пэўнай адлегласці ў часе, лягчэй заўважыць, што абодва гэтыя спектаклі мелі глыбокія карані ў тым маральным і палітычным клімаце, які спарадзіў перабудову.

Новая п'еса Дударава і яе мінскае ўвасабленне таксама плён непакою, але гэта непакой ужо іншага характару. Твор мае дзве назвы. Першая — «І быў дзень» — запазычана з евангельскай Кнігі Быція, другая — «Звалка» — больш адпавядала б сучаснаму рэпертуару. П'еса Дударава і прапанаваная Маслюком пастаноўка — гэта як бы два полюсы вымярэння праўды аб чалавеку: таго, што ўяўляецца адвечнай яго праблемай, і таго, што мае значэнне тут і зараз.

Героі Дударава — людзі, якія знаходзяцца па-за бортам грамадства. Такой багатай галерэі тыпаў і характараў гэтага асяроддзя савецкая драматургія дасюль не паказвала. Узнікае пытанне, як жа да такога стану дайшло? Вядома, што на гэта меў уплыў збег розных акалічнасцей, часта вельмі дзіўных, але ў рэшце рэшт кожны з гэтых людзей прыняў асабістае рашэнне пакінуць грамадства. Чаму яны так зрабілі? Чаму выкінулі свае асабовыя пасведчанні? На гэтае пытанне Дударав адказвае даволі адназначна: «Можа ён, чалавек гэты, не хоча ўдзельнічаць ні ў чым... У тым, у чым ты з асалодай, салодкай слінай удзельнічаеш...» Тым самым дно грамадства ператвараецца ў спектаклі ў рух адмаўлення. У адной са сцэн ідзе гаворка пра Галгофу гэтых людзей. Сучасная Галгофа не ўпершыню асацыіруецца ў мастака са сметнікам. Каля дваццаці гадоў назад Анджэй Вайда, здымаючы ў ФРГ свой фільм «Пілат і іншыя» паводле «Майстра і Маргарыты» Булгакава, сцэну раскрыжавання размясціў на кучы смецця на абочыне франкфурцкай аўтастрады. Дудараў быццам ідзе следам за ім. Але гэта падабенства толькі знешняе.

...Распачынаецца спектакль. На сцэну разам з групай сатаварышаў па нядолі ўваходзіць Хітры, цягнучы на сабе крыж. Ставіць яго, скідае вопратку і, прывязваючы сябе да «знака бяды», усклікае: «Лю-ю-дзі! Я прыйшоў...» Але яго ніхто не слухае — гэта, маўляў, усяго толькі выбрык дурасліўца. Боскія пакуты ператвараюцца ў фарс. Спачатку сатаварышы слухаюць Хітрага з абыякавасцю, але далей пачынаюць злавацца — у яго дурным жарце месціцца горкая самаіронія. Які сэнс маюць іх пратэст, іх адмаўленне, калі гэта нікога не цікавіць і не кранае, бо яны толькі адкіды грамадства. Іх Галгофа застанецца тым, чым з'яўляецца ў сапраўднасці, — месцам, якое яны для яе выбралі, кучай смецця.

Сімволіка «Знака бяды» і «Звалкі», а таксама спектакляў, на іх заснаваных, сваімі каранямі ідзе ў глыбіню культуры хрысціянства, у адных можа выклікаць жаданне палемікі, другіх схіліць да вываду аб росце цікавасці да рэлігійных вытлумачэнняў сучасных грамадскіх працэсаў і драм чалавека. Мне даводзілася чуць выказванні пра сувязь гэтай з'явы з юбілейнымі ўрачыстасцямі з нагоды 1000-годдзя хрышчэння Русі. Такая сувязь, магчыма, і існуе. Аднак не варта забываць, што «Знак бяды» напісаны раней таго часу, калі была дэкрэтавана перабудова пастановамі красавіцкага (1985 года) Пленума ЦК КПСС, што да набыткаў хрысціянскай культуры звяртаюцца сёння ў Савецкім Саюзе пісьменнікі, далёкія ад гэтай традыцыі з прычын і гістарычных, і геаграфічных. Некалькі гадоў назад спрабавалі было крытыкаваць кіргіза Чынгіза Айтматава за яго раман «Плаха», пабудаваны на евангельскай аснове, якой, як сцвярджалі, ён як след адчуваць не можа, бо вырас у асяроддзі культуры ісламскай. Адзначым, дарэчы, што каўнаская пастаноўка «Плахі», якая таксама аналізавалася ў «Пшыязні», уключала ў назву слова Галгофа.

Праблема складаная. Многае з'яўляецца прычынай таго, што хрысціянская культура мае такі багаты плён у рускай літаратуры і мастацтве апошняга часу. Адным з фактараў, якія маюць на гэта ўплыў, з'яўляецца маральная і інтэлектуальная ёмістасць евангельскай сімволікі. Людзі трагічнага часу лёгка адгадваюць у ёй знакі свайго лёсу. І, каб гэта заўважыць, зусім не трэба мець у кішэні ні касцельнай, ні царкоўнай метрыкі.

З чэшскай і польскай моў пераклаў

Алесь МАЖЭЙКА

Марыуш ЗІНОВЕЦ

ЗНАКІ БЯДЫ

На Беларусі вайна паглынула каля 2,5 мільёна чалавечых жыццяў. Загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі. Колькасць ахвяр палітычнага тэрору таксама вельмі вялікая, хаця, вядома, яе цяжка вызначыць дакладна. Не выключана, што яна можа дасягаць двух мільёнаў. У свядомасці тых, у чыю ся-

«Доўгае падарожжа ў ноч» Юджына О'Ніла—новая пастаноўка Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага. Яна расказвае аб складаных узаемаадносінах бацькоў з дзецьмі, даследуе падзеі, якія выклікалі драму ў гэтай сям'і.

НА ЗДЫМКУ: сцэна на спектакля.

Фота У. ШУБЫ.

У КОЛАСАВЫМ ДОМЕ

Сталася добрай завядзёнкай праводзіць у Коласавым доме ў Мінску літаратурныя чацвяргі. Апошні з іх прайшоў 18 мая, у Міжнародны дзень музеяў. Сустрэча якраз і прысвячалася гэтаму святу. Пра сядзібу і дом народнага песняра ў дамузейны перыяд расказаў сын Якуба Коласа, заслужаны работнік культуры БССР Даніла Міцкевіч. Ён прыпомніў выдатных людзей, што бывалі тут. Найчасцей да дзядзькі Якуба завітвалі яго малодшыя калегі па пяру — К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, М. Танк. Пазней — І. Шамякін, П. Панчанка, Я. Брыль, А. Макаёнак... Калі ў Мінску адбываліся пісьменніцкія з'езды ці пленумы, на іх, як правіла, прыязджалі прадстаўнікі братніх літаратур. Яны лічылі за гонар наведаць народнага паэта Беларусі. У Коласа гасцявалі А. Фадзееў, А. Твардоўскі, А. Пракоф'еў, А. Суркоў, С. Міхалкоў, М. Рыльскі, Х. Гулям. Бывалі тут і госці з-за мяжы.

Пра некаторыя цікавыя фотаздымкі, што захоўваюцца ў музеі, гаварыла старшы навуковы супрацоўнік Т. Сачанка. Першыя крокі дзейнасці Коласавага дома ў якасці музея прыгадаў кандыдат гістарычных навук Л. Мірачыцкі. Ён і Даніла Канстанцінавіч былі яго пачынальнікамі.

Сенсацыйным было слова П. Грудзінскага, даўняга сябра Коласавай сям'і. Ён падарыў музею рэдкія кнігі песняра — «Голас зямлі» і «Адпомсцім», выдадзеныя ў 1942 годзе. Яны былі надпісаны ваенным часам народнай артыстцы БССР В. Галіне. Павел Грудзінскі — брат актрысы. Ён сястрынскія рэлікві і захаваў.

Хвалюючы быў момант перадачы рэдкіх выданняў вялікага песняра. З цікавасцю слухалі прысутныя і ўспаміны самой В. Галіны, запісаныя на магнітафонную стужку. Яе, аказваецца, у адной з віленскіх школ даравалюцыі вучыла Марыя Каменская, будучая жонка Якуба Коласа. Пазней, ужо ў савецкі час, артыстка была сваім чалавекам у гэтай цікавай сям'і. Ёй, Грудзінскай (па мужу Александроўскай), прозвішча Галіна прыдумаў народны паэт.

На сустрэчы ў Коласавым доме прагучалі галасы-ўспаміны народнага паэта БССР А. Куляшова і народнага пісьменніка Беларусі М. Лынькова.

Самадзейны кампазітар і выканаўца І. Добры выканаў пад уласны акампанемент гітары некалькі беларускіх народных песень.

К. СЦЕПАНЮК.

НАЛЕЖАЦЬ НАШАЙ ГІСТОРЫІ

СТАРШЫНЯ ІНБЕЛКУЛЬТА

У 20-я гады яго імя было добра вядома ў нашай рэспубліцы. Таленавіты вучоны, старшыня навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы Беларусі, старшыня Інстытута беларускай культуры, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР, член ЦВК БССР.

І ўсё гэта ў адной асобе. Сцяпан Некрашэвіч нарадзіўся 8 мая 1883 года ў вёсцы Данілаўка Бабруйскага павета (цяпер Светлагорскі раён Гомельскай вобласці) у сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у «дарэктара». Толькі ў 25-гадовым узросце Некрашэвічу давялося скончыць Панявежыскую настаўніцкую семінарыю. Ён працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Цельшаўскім павеце Ковенскай губерні, а ў 1911—1913 гадах быў настаўнікам школы «Общества трезвости» ў Вільні. Адначасова Сцяпан Некрашэвіч вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце, які ён скончыў у 1913 годзе.

У час імперыялістычнай вайны быў мабілізаваны ў армію і ваяваў на франтах першай сусветнай вайны. Тут ён папаў пад уплыў ідэй беларускага нацыяналізму. Кастрычніцкая рэвалюцыя раскалола беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Яго буржуазна - нацыяналістычная плынь, да якой прымкнула і правае крыло Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), пасля перамогі Кастрычніка, злучыўшыся з расійскай контррэвалюцыяй, ва ўмовах нямецкай акупацыі спрабуе праклама-ваць так званую Беларускую народную рэспубліку (БНР).

Рэвалюцыйна - дэмакратычная плынь, адлюстроўваючы галоўным чынам імкненні сялян, злівацца з рэвалюцыйнай барацьбой пралетарыяту за ўсталяванне, а потым і ўмацаванне Савецкай улады.

Кастрычніцкія падзеі 1917 года засталі Некрашэвіча ў Адэсе. Ён не зразумеў і не прыняў рэвалюцыі і ўключыўся ў антысавецкую дзейнасць. Пад яго кіраўніцтвам там быў створаны і дзейнічаў контррэвалюцыйны цэнтр пад назвай «Беларускі нацыянальны камісарыят у Адэсе».

Дэмабілізаваўшыся з арміі, Некрашэвіч галоўным чынам жыў у Адэсе. Тут ён паступіў у Вышэйшы міжнародны інстытут, дзе, аднак, праслухаў толькі два першыя курсы. Некрашэвіч заснаваў беларускай секцыяй пры Адэскім губернскім аддзеле народнай асветы. Адначасова вёў значную культурна-асветную работу сярод дэмабілізаваных салдат-беларусаў і бежанцаў-беларусаў, якія воляй лёсу апынуліся ў гэтым прыморскім горадзе. Дзякуючы намаганням Некрашэвіча, у 1918 навучальным годзе ў Адэсе было адчынена «30 пачатковых беларускіх школ і беларуская змешаная гімназія ў складзе першых чатырох класаў».

13 студзеня 1919 года С. Некрашэвіч накіраваў пісьмо (на французскай мове) камандуючаму саюзнымі арміямі на Поўдні генералу Бертэлю, у якім ён свой нацыянальны камісарыят называў ужо Нацыянальным цэнтрам Беларусі. Вось што пісаў кіраўнік БНЦ камандуючаму войскамі Антанты на поўдні Расіі: «Беларускі нацыянальны цэнтр, сфарміраваны з большасці грамадскіх і нацыянальных арганізацый Беларусі, узяў на сябе ў гэты цяжкі момант фарміраванне тутэйшага ўрада, а таксама і арганізацыю беларускай арміі (заходняй арміі), якая мае мэтай, як і Добраахвотніцкая армія, барацьбу з бальшавікамі». Некрашэвіч абяцаў стварыць з бежанцаў, якія прыбылі з Беларусі, вайсковы кантынгент колькасцю да 40 тысяч чалавек. Але з гэтай задумы нічога не выйшла. Нават тыя нешматлікія фарміраванні, якія ўдалося стварыць, распадаліся пры першым сутыкненні з войскамі Чырвонай Арміі.

Гаворачы аб дзейнасці Лёсіка і Некрашэвіча, якія засталіся ў Савецкай Беларусі і далучыліся да навуковай работы, даследчык А. Залескі трапна заўважыў, што гэта было блуканне па пакутах.

З гісторыі не выкрасліш і той факт, што 25 снежня 1920 года на з'ездзе Беларускай партыі эсэраў, які адбыўся ў Мінску, менавіта С. Некрашэвіч патрабаваў, каб гэта партыя перайшла ў падполле і пачала «актыўную ўзброеную барацьбу з камуністамі». Але хутка ён адыходзіць ад палітычнай дзейнасці і займаецца навуковай, грамадскай, арганізацыйнай працай.

Пасля вызвалення Беларусі ад белапалякаў Сцяпан Некрашэвіч пераязджае ў Мінск і працуе ў Народным камісарыяце асветы БССР. Спачатку загадчыкам літаратурна-выдавецкага аддзела, пасля намеснікам старшыні Акадэмічнага цэнтра, інспектарам навуковых устаноў і намеснікам старшыні Галоўпрафасветы. Адначасова з гэтым Некрашэвіч з 1921 года быў старшынёй навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы рэспублікі. У канцы 1920 — пачатку 1921 года паўстала пытанне аб арганізацыі першага навукова-даследчага цэнтра ў рэспубліцы — Інстытута беларускай культуры. У будынку Наркамата асветы сабралася каля 50 працаўнікоў культуры з многіх гарадоў рэспублікі. Быў заслуханы даклад С. Некрашэвіча аб беларускім культурным адраджэнні, з якога вынікала, што трэба «арганізаваць адпаведную лабараторыю» і назваць яе Інстытутам беларускай культуры. «Гэтая ўстанова, — адзначыў Сцяпан Міхайлавіч, — пры самай шырокай дапамозе нашае сацыялістычнае ўлады, павінна згуртаваць вакол сябе ўсе беларускія сілы, дзе б яны ні знаходзіліся, выкарыстаць іх па прамому прызначэнню і быць адказнай за культурную справу на Беларусі».

Удзельнікі сходу віталі прапанову адказнага работніка Наркамасветы рэспублікі і прынялі рашэнне аб стварэнні ў Савецкай Беларусі Інстытута беларускай культуры. Аднак заснаваць Інбелкульт у той час не ўдалося з-за таго, што не было кваліфікаваных кадраў, матэрыяльных сродкаў, будынка і грунтоўнага плана дзейнасці, хаця ідэя стварэння ІБК засталася і была рэалізавана ў форме асобнай навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы. У склад камісіі ўваходзілі гуманітарная, прыродазнаўчая і матэматычная секцыі. Актыўны ўдзел у рабоце гуманітарнай секцыі прымалі Янка Купала, Якуб Колас, Я. Сушынскі і іншыя.

Душой і арганізатарам усёй дзейнасці камісіі быў Сцяпан Некрашэвіч. Хутка па-беларуску загаварылі Карл Маркс, Фрыдрых Энгельс, Уладзімір Ільіч Ленін, набыла свае правы беларуская мова ў палітэканоміі, фізіцы, хіміі. Камісія працавала на грамадскіх пачатках. А праца гэта была нялёгкая: вывераць усе тэрміны, каб народ успрыняў іх арганічна, каб яны не выглядалі ў роднай мове чужароднымі. Чаго-чаго, а спрэчак тут хапала. Пурытанізму спадарожнічаў звычайны правінцыялізм, самаўпэўненаму лявацтву, апломбу супрацьпастаўлялася самабытнасць, якая ў сапраўднасці абарочвалася эстэтычнай глухатой да слова, яўным неразуменнем народнага духу. Парасон раптам аб'яўляўся «растапырнікам», галёшы — «макраступамі». Альбо конус прапаноўвалася назваць «стажком». Ах, як па-сялянску, па-беларуску! Дайшло нават да таго, што нехта з непапраўных наватараў настойваў на замене слова «рэвалюцыя» словам «пярэздры» — ад рускіх слоў «распри», «раздор».

Некрашэвіч рашуча паўставаў супраць насілля над мовай, адзначаў, што работа са словам — адказная і высакародная і перш за ўсё павінна быць удумлівай.

Ужо праз два з паловай месяцы пасля ўтварэння навукова-тэрміналагічнай камісіі яе секцыі апрацавалі каля 2 270 тэрмінаў, акрамя таго, звыш 5 тысяч тэрмінаў было падрыхтавана для зацвярджэння.

Паспяховая работа камісіі дала добрыя падставы для рэалізацыі рашэння аб стварэнні Інстытута беларускай культуры.

30 студзеня 1922 года на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі была заснавана першая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова рэспублікі — Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Старшынёй яго стаў С. Некрашэвіч, сакратаром — У. Чаржынскі, правадзейнымі членамі — І. Луцэвіч (Янка Купала), К. Міцкевіч (Якуб Колас), Я. Лёсік і Я. Карскі.

За 1922—1924 гады Інстытут беларускай культуры пад кіраўніцтвам С. Некрашэвіча правёў значную навуковую работу, асабліва па распрацоўцы тэрміналогіі, складанню і выданню падручнікаў для школ. Паспяхова праводзіліся экспедыцыі па вывучэнню прыродных багацяў і культуры Беларусі. У сувязі з адкрыццём сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве кіраўніцтва Інбелкульта накіравала ў Чэрвеньскі і Бабруйскі раёны этнаграфічныя экспедыцыі, якія сабралі каля 340 экспанатаў матэрыяльнай і духоўнай культуры (сярод іх тканіны, паясы, вышыўка, музычныя народныя інструменты і інш.) і зрабілі шмат фотаздымкаў. Беларускі этнаграфічны аддзел на выстаўцы атрымаў вышэйшую прэмію.

Характэрнай з'явай таго часу была арганізацыя краязнаўчага руху. Некрашэвіч — адзін з ініцыятараў стварэння пры Інстытуце беларускай культуры ў 1924 годзе Цэнтральнага бюро краязнаўства.

25 ліпеня 1924 года было зацверджана «Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры», згодна з якім Інбелкульт быў вызначаны як вышэйшая дзяржаўная навуковая ўстанова рэспублікі. Яго старшынёй быў выбраны У. Ігнатоўскі. А правадзейны член Інбелкульта С. Некрашэвіч працаваў намеснікам старшыні Галоўпрафасветы Наркамата асветы БССР. Працаваў ён таксама выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Першы рэктар БДУ прафесар Уладзімір Пічэта добра ведаў С. Некрашэвіча і паважаў яго за эрудыцыю і арганізатарскі талент. Яшчэ ў 1922 годзе ён запрасіў Сцяпана Міхайлавіча выкладаць студэнтам беларускую мову. Але ў той час Некрашэвіч быў вельмі заняты. У архіўных фондах захаваўся яго адказ праўленню Беларускага дзяржаўнага універсітэта ад 4 мая 1922 года: «З прычыны запрашэння мяне праўленнем Універсітэта для выкладання беларускай мовы на медфаку паведамляю, што пры ўмове абавязковасці гэтага прадмета на азначаным факультэце магу пачаць выкладаць яго з наступнага навучальнага года. Аб Вашым рашэнні прашу апавясціць мяне, каб мець магчымасць загадзя выпрацаваць пэўную праграму і курсы, якія мною будуць прадстаўлены з пачатку наступнага навучальнага года на зацверджанне Універсітэта.

Старшыня Інстытута
беларускай культуры
(С. Некрашэвіч).»

Эмануіл ІОФЕ.

(Заканчэнне будзе).

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

МІЖНАРОДНЫ КНІЖНЫ КІРМАШ-89

«У аснову маючага адбыцца Маскоўскага кніжнага кірмашу будзе пакладзена камерцыйная дзейнасць», — падкрэсліў намеснік старшыні Дзяржкамвыда СССР Васіль Сласцяненка.

Гэтую заяву ён зрабіў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай маючаму адбыцца кніжнаму форуму.

ММКК праводзіцца сёмы раз. У гэтым годзе чакаецца нямала новаўвядзенняў. Відавочна, што грамадска-палітычныя пераўтварэнні ў СССР аказваюць уплыў і на развіццё кніжнай сферы.

Па-першае, парушана традыцыя, і ММКК пройдзе з 12 па 18 верасня, а не раней, як, скажам, у мінулым годзе.

Па-другое, зменена назва форуму — ужо не «выстаўка-кірмаш, а толькі «кірмаш», гэта значыць робіцца акцэнт на камерцыйны характар.

Па-трэцяе, упершыню савецкія кнігавыдавецкія і кнігараспаўсюджвальніцкія арганізацыі скарыстаюць прадастаўленае ім права наладжваць прамыя эканамічныя сувязі з замежнымі партнёрамі, без усякіх віз і ўзгадненняў. Гэта, безумоўна, адкрые новыя магчымасці супрацоўніцтва, стане стымулам для больш актыўнага пошуку партнёраў.

Падрыхтоўка да правядзення ММКК-89 праходзіць пад лозунгам «Прыязджайце гандляваць». Такі заклік наўрад ці здзівіць замежных гасцей, але для савецкіх выдаўцоў ён у многім гучыць яшчэ як адкрыццё. Тым не менш агульны пункт гледжання савецкіх удзельнікаў: камерцыя павінна стаць паўнаўладнай гаспадыняй на маскоўскім кірмашы.

Як паведамілі на прэс-канферэнцыі, першая палавіна кожнага кірмашовага дня будзе адведзена толькі для спецыялістаў. Колькасць гасцей, запрошаных і акрэдытаваных на кірмашы, істотна скароціцца. Гэта дасць магчымасць стварыць большыя зручнасці для прадстаўнікоў фірм і выдавецтваў.

Будзе рэзка скарочана і колькасць выставачных кніг. На стэндах зойме ў асноўным месцы толькі прадукцыя, якая мае камерцыйны поспех.

Намеснік старшыні Дзяржкамвыда СССР адзначыў, што ўдзел савецкіх арганізацый у ММКК павінен быць падпарадкаваны перш за ўсё інтарэсам развіцця экспарту савецкіх друкаваных выданняў. Таму ў экспазіцыю ўвойдуць у першую чаргу макеты будучых выданняў для пастаўкі ў 1989 і 1990 гадах, а таксама выпушчаныя ў перыяд паміж кірмашамі кнігі, якія маюць рэальны таварны запас.

Улічваючы, што замежныя ўдзельнікі зацікаўлены ў сваю чаргу ў продажы ўласных кніг, праведзена старанная падрыхтоўка аб'яднанняў «Саюзкніга» і «Міжнародная кніга» для закупкі замежнай літаратуры.

У рамках ММКК-89 пройдуць дзве міжнародныя спецыяльныя экспазіцыі: «Кніга і міжнароднае супрацоўніцтва ў вырашэнні сусветнай харчовай праблемы» і выстаўка навукова-тэхнічнай часопіснай перыёдыкі.

Ужо пацверджаны шырокі ўдзел у кірмашы выдавецтваў сацыялістычных краін, паступілі заяўкі ад кнігагандлёвых аб'яднанняў і фірм Бельгіі, Швейцарыі, ФРГ, Аўстраліі, Японіі, Індыі. Мяркуецца павялічыць удзел у ММКК выдавецтваў ЗША і Вялікабрытаніі. Заяўкі працягваюць паступаць, і не выключана, што ММКК-89 стане рэкордным па колькасці дзяржаў-удзельніц і фірм, які экспануюць сваю прадукцыю.

Гаўрыіл ПЕТРАСЯН.

Зусім нядаўна гасцінна расчыніў дзверы перад віцябчанамі Палац культуры і тэхнікі лёгкай прамысловасці. Тут пабывалі ўжо многія жыхары абласнога цэнтра. Вабіць іх прыгажосць самога будынка — унікальнага па архітэктуры і аздабленню, у якім скарыстаны граніт, мармур, рыфавы вапняк. Прыцягвае сюды і шырокая магчымасць выбару форм адпачынку. Апрача зручных пакояў для гурткавай работы і заняткаў тэхнічнай творчасцю, у Палацы ёсць утульнае кафэ, чатыры камерцыйныя залы: тэатральна-канцэртная на 1 150 месцаў, малая, прасторная танцавальная, якая ўмяшчае да 600 чалавек, і камерная тэатральная.

НА ЗДЫМКАХ: многа цікавага ўбачылі на выстаўцы дзіцячай творчасці ў Палацы Лена САГАН і Уладзік КОНАЎ; на сцэне — народны ансамбль «Лявоніха».

Фота А. ЦАРЛЮКЕВІЧА.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

БАРАНАВІЦКІЯ МАЗАІКІ

У новай экспазіцыі Баранавіцкага гісторыка-краязнаўчага музея (часова музей закрыты, вядуцца рамонтныя работы) будуць выстаўлены каляровыя буйных памераў фатаграфіі мазаік, якія выкананы па эскізах вядомых рускіх мастакоў: Віктара і Апалінарыя Васняцовых, М. Бруні, М. Кошалева, В. Думітрашкі.

Тэматыка мазаік, сюжэты ў асноўным рэлігійныя: «Маці боская з дзіцем», «Аб табе радуемся», «Сімяон Полацкі», «Збавіцель з данатарам», «Маці боская з анёламі». З усяго гэтага незвычайнага збору перш за ўсё выдзяляюцца, «пазнаюцца» сваёй народна-казачнай трактоўкай, яркім каларытам і сваім несумненным падабенствам з роспісам Уладзімірскага сабора ў Кіеве, работы таксама В. Васняцова. Адзенне яркае— вішнёвае, сіняе, светла-охрыстае, адкрытыя, выразныя твары, асветленыя ззяннем залатых німбаў. Жаночыя твары вельмі падобныя да твараў казачных васняцоўскіх царэўнаў і рускіх дзяўчат, калі ён іх паказваў у стылізаваным маляўнічым адзенні. Так што і ў рэлігійных па тэматыцы манументальных мазаічных палотнах аўтар славутых «Алёнкі», «Волатаў» заставаўся верным сваёй дэкаратыўна-казачнай стылістыцы пісьма, сваім любімым народна-гістарычным тэмам.

Мазаічны партрэт Сімяона Полацкага належыць Апалінарыю Васняцову. Выдатны грамадскі і царкоўны дзеяч, пісьменнік, публіцыст XVII стагоддзя Сімяон Полацкі паказаны амаль у поўны рост. Спакойны, строгі твар мудрага чалавека. Яго вучонасць, асветніцкую дзейнасць сімвалізуюць раскрытая кніга і спісаны кірыліцай скрутак, якія манах Сімяон трымае ў левай руцэ, а ў правай — пяро. Колеры прыглушаныя — карычневы, цёмна-чырвоны, сіні. Але і гэтая работа і па тэме, і па манеры выканання характэрная для Апалінарыя Васняцова, яго прыхільнасці да гістарычных пейзажаў, цікавасці да гістарычных асоб.

Але чаму менавіта з гэтымі мазаічнымі палотнамі будзе знаёміць наведвальнікаў музей, якое дачыненне яны маюць да Баранавічаў? Аказваецца, самае непасрэднае: гэтыя выдатныя творы манументальна-дэкаратыўнага жывапісу можна ўбачыць у Баранавічах і ў арыгінале, імі знутры і звонку дэкарыраваны Пакроўскі сабор.

Стараліся мазаікі баранавіцкага Пакроўскага сабора з 1902 па 1911 год у Пецярбургу ў мазаічнай майстэрні В. Фралова з прыцягненнем плеяды вядомых мастакоў, але не для баранавіцкай царквы, а для сабора Аляксандра Неўскага ў Варшаве, грандыёзнага збудавання, узвядзенне якога працягвалася шаснаццаць гадоў. Рашэнне царскага ўрада мець у цэнтры Варшавы на Саксонскай плошчы велічны праваслаўны сабор насіла палітычны характар. Пасля падзелаў у канцы XVIII стагоддзя Польшча як самастойная дзяржава не існавала ўжо сто год, хаця за гэты час на яе тэрыторыі тройчы ўспыхвалі нацыянальна-вызваленчыя паўстанні. Узвядзенне ў цэнтры Варшавы па рашэнню рускага ўрада сабора як бы замацоўвала падпарадкаванне Польшчы царскай Расіі.

З самага пачатку (а ўрад прыняў рашэнне аб будаўніцтве сабора ў 1893 годзе) ажыццяўленне праекта планавалася даручыць лепшым дойлідам і мастакам, гэта значыць сабор павінен быў уражваць не толькі сваімі памерамі, але і мастацкімі вартасцямі. У адкрытым конкурсе на архітэктурны праект сабора прынялі ўдзел пяць акадэмікаў архітэктуры, лепшым быў прызнаны праект пецярбургскага архітэктара Лявонція Бенуа.

Між іншым, у Пакроўскім саборы ёсць партрэт архітэктара Бенуа: на мазаіцы М. Кошалева паказаны ўкленчаны дойлід, які падносіць мадэль варшаўскага сабора Хрысту. (Прафесару Акадэміі мастацтваў, аўтару архітэктурных праектаў многіх грамадзянскіх і адміністрацыйных збудаванняў, вядомаму педагогу — Лявонцію Бенуа Савецкі ўрад аднаму з першых прысвоіў званне заслужанага архітэктара РСФСР).

Варшаўскі сабор (будаўніцтва яго завяршылася ў 1912 годзе) выдзяляўся не толькі памерамі (у ім магло знаходзіцца адначасова да дзвюх з палавінай тысяч чалавек, гэта значыць у пяць-шэсць разоў больш, чым у звычайнай царкве), але і архітэктурным рашэннем — арыгінальнай, выразнай архітэктурнай кампазіцыяй, нягледзячы на яго масіўнасць, манументальнасць. Адзначалі сучаснікі і несумненную мастацкую дасканаласць яго насценных роспісаў і асабліва мазаік. Але лёс варшаўскага сабора быў трагічны. Прастаяў ён, хаця і будаваўся на вякі, усяго чатырнаццаць год. У 1916 годзе сабор быў пераўтвораны ў лютэранскую царкву, а ў 1926 — увогуле ўзарваны, знішчаны. Войны скончыліся, Польшча набыла незалежнасць, але працвітала антысавецкая, антыруская палітыка, і ахвярай гэтага фанатызму сталі многія праваслаўныя цэрквы на тэрыторыі Польшчы, у большасці на ўкраінскіх і беларускіх землях, у тым ліку шэдэўр манументальнага дойлідства, сабор Аляксандра Неўскага ў Варшаве. Ён уключаў у сябе бясцэнныя па сваіх мастацкіх вартасцях унікальныя насценныя роспісы і мазаічныя палотны, памеры якіх вылічваліся тысячамі квадратных метраў.

Аднак не ўсе мазаікі загінулі, зніклі. Знайшліся людзі, якія ведалі іх мастацкую каштоўнасць і з немалой рызыкай выратавалі частку мазаік. У 1926-1927 гадах яны і былі перапраўлены (а гэта ж дзесяткі тон смальты) у Баранавічы, дзе якраз узводзіўся Пакроўскі сабор. Вось дзякуючы якому збегу акалічнасцей, створаныя ў пачатку стагоддзя ў Пецярбургу мазаікі трапілі сюды.

Але аб існаванні ў нас у рэспубліцы гэтых высокамастацкіх твораў манументальнага жывапісу літаральна да апошняга часу ведалі толькі нямногія мастацтвазнаўцы і мастакі. Параўнаўча нядаўна, у 1972 годзе, у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі да артыкула «Мазаіка» была дадзена каляровая рэпрадукцыя з мазаікі Апалінарыя Васняцова «Сімяон Полацкі» з указаннем: мазаічнае палатно ў баранавіцкім Пакроўскім саборы. І, нарэшце, у брэсцкім томе «Помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», які выйшаў у 1984 годзе, з'явіліся звесткі аб баранавіцкім Пакроўскім саборы і яго мазаіках.

Аднак да сёння баранавіцкія мазаікі чакаюць сапраўднай, кваліфікаванай атрыбуцыі і дастойнай інфармацыі аб іх, каб увайсці ў фонд мастацкіх каштоўнасцей рэспублікі. Акрамя таго, неабходна прыцягнуць увагу грамадскасці, а затым і рэстаўратараў да многіх мазаічных работ, фрагментаў, што захоўваюцца ў падвалах сабора. Мяркуюць, што ў Пакроўскім саборы размешчана толькі дзесятая частка перавезеных у Баранавічы мазаік.

Леанід ПРАКОПЧЫК.



Якіх толькі студняў не ўбачыш, калі трапляеш у Іванаўскі раён!
Бадай, няма такіх ні на Міншчыне, ні на Віцебшчыне. У іванаўскіх свой каларыт, свая адметнасць. Глядзіш на вясковы пейзаж са студняй і заўважаеш, прынамсі, дзве асаблівасці: тутэйшыя сяляне не толькі вызначаюцца гаспадарлівасцю, але і ўмеюць цаніць прыгажосць. Зрэшты, яны сваімі рукамі і сваёй фантазіяй ствараюць тое, што мы ў наш век называем эстэтыкай асяроддзя.
Самымі простымі лічацца студні-кайдубы. Рабіліся яны проста: у выкапаны ў зямлі праём заганялі выдзеўбаны з сярэдзіны ствол тоўстага дуба даўжынёй тры-чатыры метры. Рабілі гэта ў тых месцах, дзе ўзровень залягання грунтавых вод невялікі.
Цікавая ў іванаўцаў па сваёй архітэктуры тая частка калодзежа, якая з'яўляецца механізмам для пад'ёму вады. Вабяць вока яшчэ здалёк «жураўлі» розных канструкцый. Хочацца спыніцца і разгледзець, як зроблены «калаўрот». Як хораша, што не перавялася спрадвечная традыцыя, што не зруйнаваў яе наш прагматычны час шаблону і уніфікацыі.
НА ЗДЫМКАХ: студня ў вёсцы Моталь; крыніца ля вёскі Псышчава; студня ў вёсцы Моладава. Фота С. КРЫЦКАГА.

ТОЕ-СЁЕ ПРА БАБРОЎ

Яшчэ індзейцы здзіўляліся розуму і працавітасці «інквоя» (вадзянога звера) — бабра. Яны лічылі баброў «маленькімі людзьмі лясоў». Бабровае футра здаўна славілася ў нашым краі і цанілася вышэй за сабалінае, пра баброў гаварылася ў царскіх законах і нават у дагаворах паміж суседнімі краінамі.

Сямейства бабровых складаецца з двух відаў: звычайнага, ці рачнога, і канадскага. Даўжыня цела баброў дасягае 120 сантыметраў, маса — да 30 кілаграмаў. Трымаецца бабёр старыц, рэк з павольнай плынню, азёр з багатай воднай і прыбярэжнай расліннасцю.

Агульная колькасць баброў у Беларусі — каля 25 тысяч асобін. Яны з'яўляюцца выдатнымі плыўцамі і ныральшчыкамі, самымі выдатнымі будаўнікамі сярод жывёл-млекакормячых. Тое, што бабры «нарабілі» ў заказніку «Антонава» Лагойскага раёна Мінскай вобласці, уразіла нават вопытных заолагаў і паляўніцтвазнаўцаў. На плошчы 77 гектараў яны збудавалі больш за 10 хатак, 20 вялікіх і мноства дробных плацін, якія ўтварылі цэлыя каскады вадасховішчаў. У адным такім каскадзе было 6, а ў другім 8 плацін і сажалак. Цікавыя і сістэмы пад'ёмных бабровых нор і каналаў, якія мясцовыя жыхары называюць «бабровым метро».

Іван ШПАДАРУК.

СУПРАЦОЎНІЧАЮЦЬ ПАРОДНЕНЫЯ РЭГІЁНЫ

МАРШРУТЫ ПАБРАЦІМАЎ

Прамы турысцкі маршрут звязаў пародненыя рэгіёны — Влоцлаўскае ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі і Магілёўскую вобласць. З горада над Дняпром у брацкую рэспубліку адправілася першая група турыстаў — актывістаў Таварыства савецка-польскай дружбы. За дзевяць дзён яны зробяць экскурсіі па гістарычных і памятных мясцінах ваяводства, адпачнуць на славутым курорце Цэхацінек, наведаюць сталіцу рэспублікі, Тарунь і іншыя гарады. Група з Влоцлавека ў гэтыя ж дні пазнаёміцца са славутасцямі Магілёўскай вобласці, пабывае ў Мінску, Брэсце, у пасёлку Леніна.

Прамы турысцкі маршрут адкрыты ў адпаведнасці з праграмай двухбаковага супрацоўніцтва працоўных Влоцлаўскага ваяводства і Магілёўскай вобласці, якіх звязвае дванаццацігадовая дружба. Яны спаборнічаюць, абменьваюцца вопытам работы. Трэці год вядзецца ўзаемавыгадны абмен таварамі на безвалютнай аснове. Летась, напрыклад, па ўзроўню прыгранічнага гандлю Влоцлаўскае ваяводства і Магілёўская вобласць выйшлі на першае месца сярод пародненых рэгіёнаў СССР і ПНР. Традыцыйнымі сталі Дні культуры, паездкі калектываў мастацкай самадзейнасці, выстаўкі прафесійных і самадзейных мастакоў і твораў народнай творчасці, спартыўныя мерапрыемствы.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Зак. 627